Абай
Стэпавы
прастор

Абай

Стэпавы прастор

Выбраныя вершы

Пераклад з казахскай

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2011

УДК 821.512.122-1
ББК 84(5Каз)-5
А13

Пераклад з казахскай
Міколы Мятліцкага

Выпуск выдання
ажыццёўлены пры фінансавай падтрымцы
Пасольства Рэспублікі Казахстан
у Рэспубліцы Беларусь

ISBN 978-985-6994-31-2

© Мятліцкі М. М., пераклад
на беларускую мову, 2011
© Афармленне. РВУ «Літаратура
і Мастацтва», 2011

МЫСЛЯР, АСВЕТНІК, ГУМАНІСТ

Ёсць паэты, чыіх зямных дзён дастаткова, каб не толькі абяссмерціць сваё ўласнае імя, але і падараваць бессмяроцце народу, да якога яны прыналежаць. У рускіх гэта Пушкін, ва ўкраінцаў — Шаўчэнка, у беларусаў — Купала. Менавіта з плеяды такіх волатаў і казахскі мысляр, асветнік і гуманіст Абай Кунанбаеў — аўтар пранікнёных вершаў і паэм пра лёс простага чалавека з казахскіх стэпаў, а таксама незабыўных маральна-этычных настаўленняў-сказанняў, вядомых сягоння кожнаму даросламу жыхару Казахстана.

Абай (Ібрагім) Кунанбаеў нарадзіўся ў 1845 годзе ў Чынгізскіх гарах Сяміпалацінскай вобласці ў качэўі роду Табыкты, у той мясцовасці, якая засталася духоўнай скарбонкай многіх цудоўных легенд і паданняў казахскага народа.

Па сведчанні сучаснікаў, Абай пачаў складаць вершы вельмі рана. Але многія з ранніх твораў паэта да нас не дайшлі. Сур'ёзна да сваёй творчай дзейнасці ён стаў адносіцца ўжо ў сталым узросце. Гэта якраз быў той перыяд (канец 1870-х і 1880-я гады), калі ён асабліва інтэнсіўна і плённа займаўся вывучэннем фальклору, твораў усходняй класікі і рускай літаратуры.

Абай Кунанбаеў, як і Янка Купала, пражыў усяго 60 год, за якія паспеў падараваць свайму народу і свету цэлы шэраг па-мастацку дасканалых літаратурных шэдэўраў, тым самым узняўшы казахскую літаратуру на новую ступень развіцця.

Сваёй геніяльнай творчасцю вялікія паэты сталююць масты дружбы, рухаючы па іх сказ пра лёс свайго народа

на ўсё новыя шыроты свету. І сягоння, дарагі беларускі чытач, у цябе паявілася магчымасць пазнаёміцца з выбранымі вершамі Абая на роднай беларускай мове. Нашы народы на гістарычным шляху развіцця яднае і родніць трывучая мужнасць выжывання, мара пра лепшую будучыню і ўсталяванне будучыні як явы — усё тое, што робіць народ годным, духоўна адметным, пачутым у цэлым свеце. Упэўнены, што і сэрцу беларуса будуць жаданымі і зразумелымі хваляванні і мары вялікага казахскага паэта пра лепшую долю сваіх суайчыннікаў, яго не столькі тужлівая, як душэўна прасветленая песня.

Анатоль СМІРНОЎ,
Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол
Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь

* * *

О сэрца, свой жар астудзі,
Часіна спачыць нам з табой.
Усё, што шукаеш, — знайдзі,
Трывогу сваю супакой.
А змоўкне аднойчы біццё, —
Не мець чарнавокім бяды.
Каханага знойдуць заўжды,
І шчасце азорыць быццё.
Блукаеш з тугою начной,
Імкнеш да дзяўчыны адной.
Я з крыўдай спыніцца малю,
Сябе безаглядна гублю.
Ад горкіх ты высахла дум.
Калі ж твой суцішыцца сум?
О сэрца, дарогай ідзі,
Пакутны ты выбрала шлях.

О сэрца, свой жар астудзі,
Агнём не палай у грудзях.
Ды словы падобных парад
Табе дапамогуць наўрад,
Красуні не зразумець,
Што схованак не займець
І ззянню апушчаных воч,
Бо позірк іх агнявы;
Што абвяшчае — кроч! —
Каханне свае правы;
Што песні тваёй ручай
Знікае ў бясплодных пясках.
І зноў засамоціцца шлях,
І волю падменіць адчай.

О сэрца, свой жар астудзі,
З самотай расстанься пустой.
О сэрца, дарогай ідзі,
Пад поўняю залатой
І наша юнацтва прайшло,
Табе адзінотна было,
Стамілася ты ад хады.
Не тыя ўжо нашы гады!
Далей што? Спыніся, пастой.
Звароту не будзе назад.
Хай вернасцю шчырай святой
Я любай прывеціў пагляд —
Не выпіта радасць да дна,
І зможа, як колісь, яна
Паўстаць у сваёй варажбе,
Каханнем адкажа табе, —
Ці ж нам дачакацца дабра?
Не тая ўжо наша пара!
А грэшнасць — пагібель дваім,
Прад Богам адкажам сваім…
Хай жаркі агонь не згас,
Красуні кахаюць нас, —
Не лепей было б нам з табой,
О сэрца, знайсці супакой?
О сэрца, свой жар астудзі.
Чаго ж яшчэ сёння хацець?
О сэрца, таго і глядзі,
Не доўга табе грукацець…
Гады прамільгнуць чарадой,
Агонь болей не шугане,
Табе не скажу я: «Стой!» —
Замоўкнеш само ўва мне.
Не цешся завабай пустой,
Астынь, не палай, не млей,
Не хопіць цябе, зразумей,

Маланка цябе апячэ!
Будзь скарбам адзіным маім.
Хай джаляць іскрыны вачэй,
А ты не адказвай ім…
Спакоем рызыкаваць,
Прад позіркам маляваць
Уцехі мінулых дзён?
Мы будзем не раз шкадаваць,
Што явай не стаўся сон.
На вочы патрапім другім,
Сябе ператворым у дым,
У чэзлы, маркотны цень.
У прошласць сышоў наш час,
Насмешкай зняважаць нас:
На захад схіліўся наш дзень…

О сэрца, свой жар астудзі,
Таго, што прайшло, не будзі,
Ад жару пачуццяў спачынь,
Красунь у спакоі пакінь,
Адну абяры для любві,
Сяброўкай яе назаві,
Сяброўкай на ўсе гады.
Яна прынясе з сабой
Мне — радасць, табе — спакой,
І будзе між нас заўжды…

1881

* * *

Вершнік з беркутам скача ў густых снягах.
Будзе пільным — здабудзе лісу ў гарах.
Вось знаходка ў дарозе: чаму ж не ўбор?
Конь імклівы ды вершнік… Забыты страх
Ды лісы асцярожны зваротны след,
Што на вочы патрапіў у чорных кустах.

Ля падножжа гары — паляўнічы стан.
Вершнік з беркутам мчыцца, нібы ўраган.
Ён сарве клабучок з пільна ўзнятых воч:
Беркут крылы раскіне — высокі сан.
«Як жа нізка мы скачам, ліса збяжыць!» —
Ён падумае так, калыхне туман.

Не ўратуе лісу спрытны бег цяпер.
І замрэ, і пакажа зубоў ашчэр,
Заякоча-затужыць і гляне ўвыш.
І яна хоча жыць, у яе — свой намер!
Вось відовішча! Вершнік прадоўжыць шлях,
Гулкі цокат капытны ўспалошыць ціш.

Беркут ведае сілу лісіных зубоў —
Выпускае адразу сорак клінкоў.
Ды не будзе марудзіць беркут-батыр:
Восем лёзаў аголіць сваіх кіпцюроў,
Крылы дужа раскіне, пад неба ўзляціць,
Важкім каменем зрынецца з вышы зноў.

Вось сышліся, спляліся ў пламенні зары,
Быццам адзінаборцы-багатыры.
Як царыца зямлі і нябесны цар.
Пажадаў чалавек — і яны, цары,

На смерць б’юцца… І толькі — бліскота-бель.
Футра чырвань і крыл чарната ўгары.

Як купанне дзявочае ў горнай рацэ,
Бітва тая, калі яна на руцэ
Дзве касы смаляныя трымае, плыве,
Юнь-пяшчота краплінай зырчыць на шчацэ,
Свеціць целам бялюткім, усмехам вачэй
Нагадае якраз табе — гэткай слыве

Жаніха і нявесты першая ноч.
Ім на ложы зацесна… Ліса наўскоч:
Беркут змяў і згарнуў яе пад сабой.
Лоўчы, спешна цяпер па здабычу кроч!
Перамога лунае над хітрай лісой,
Пераможцы імчацца — з дарогі збоч!

І хваляць старэйшыны зноў смельчака:
«Які малайчына, не ўздрыгне рука!»
І ты задаволены… крэпкі тытунь
Кладзеш за губу — і нямее шчака.
Бы ягад у лесе — хай будзе лісіц,
Каб чуў паляўнічы азарт юнака.

І ведай, ніякай не будзе бяды,
Як зноўку на ловы прыбудзеш сюды.
Няма мне пад сонцам занятку лацвей,
Быць між паляўнічых гатоў я заўжды.
Хто мае пранікліві розум, той сам
Мяне зразумее з паўслова тады.

Не бачна сляпому у стэпах трава,
Не ўцяміць пустая мой сказ галава.
Ды ўзнікне карціна ў тваёй душы,
Калі ўцяміш тое, як двойчы два,
Сапраўднаму лоўчаму радасць чутна,
Хто беркута высачыў зноў з-пад брыва.

1882

* * *

Быццам месяц, што выгнуты ў небе начным,
Лоб ільсніцца, як срэбра, і броў лёгкі ўздым
Над стаёнасцю чорных, як поўнач, вачэй.
Нікне свет — і нямее душа перад ім.

Носік вузкі, ён дыхае звабаю сам.
Зыркі водсвет ланіт — на здзіўленне вачам.
Сэрца, бачачы ўсмешку, хмялее, калі
Бліснуць зубы — сапернікі ўсім жэмчугам.

Як разліў ручая — мовы светлай бруя,
Смех залівісты мкне, быццам трэль салаўя,
Шыя — шоўк беласнежны, о гнуткасць і бель!
Падбародак, о свежасць, адзнака твая!

Рост сярэдні ў яе ды прываблівы стан.
Тонкі выгіб спіны, позірк — сінь-акіян.
Чарацінкаю лёгкаю гнецца яна, —
Спелых яблык-грудзей саладжавы дурман.

Па-дзіцячы пяшчотны яе галасок,
Пальцы гладкія, вуснаў малінавы сок,
І стаёны туманіцца светлы пагляд,
Калі косы рассыплюць свой чорны паток.

Тут дзяўчаты — усе! — з патаемнай красой.
Іх нядоўгі па часе душэўны спакой —
На чароўнай зары васямнаццаці год
Накіруе жыццё іх пуцінай цяжкой.

Затаілі хітрынку прытворства адны,
Бы не ведаюць полымя страсці яны.
І залішне адважныя тыя, каму
Плесці сеткі какецтва, пустой балбатні.

Нам дзявочыя хітрыкі ведамы ўсе:
Той ім любы, хто век паважаны людзьмі.

Так і хлопцы: адны, бессаромна паўсюд,
Непрыступнасці гнеўны выносяць прысуд,
А другія, хто сціплы, — без пыхі і зла
Пазіраюць на юных красунь, як на цуд.

Толькі лепшы з усіх той, хто ў лёсе сваім
Не прабавіў і дня ў марнатраўстве пустым,
Хто свой дух гартаваў у працоўным агні,
Мае статак і з раніцы ходзіць за ім.

1884

* * *

Я не думаў пра веды, як быў маладзей,
Хоць і бачыў, што з імі жывецца лягчэй.

Вырас я, але веды мяне абышлі,
І пабег я за імі як можна хутчэй.

Хто ж у тым вінаваты, што ў невуках я?
Не гібеў бы мо так, знатным быў між людзей.

Найвышэйшая радасць — дачушкі, сыны.
Сам жадаў, каб пабачылі веды яны.

Ў медрэсэ іх аддаў, каб былі разумней,
А не з тым, каб ішлі ад людзей ім чыны.

Як імкнуўся я ўвысь, аж сягаў да аблок,
Першым быў між казахаў — засвоіў урок.

Ды нікога няма, хто б за мною ступіў, —
Я пагасну адзін, бы ў кастры вугалёк.

1885

* * *

Вось і старасць. Скуты думкі, дрогкі сон.
Дух самотны, зноўку гнеў бярэ ў палон.
Думкай з кім мне падзяліцца? Дзе і хто
Той, хто здатны падтрымаць мой творчы плён?

Ёсць народзін і мярлін жывыя дні,
Дзён мінулых не вярнуць мне з цішыні.
Радасць недзе застаецца ў схове год,
Гаснуць-меркнуць шчасця знанага агні.

Будзь разважным, дух гартуй у барацьбе,
Толькі дурань лёс скупы, як стог, скубе.
Толькі лены, патураючы другім,
Бедны духам і няўпэўнены ў сабе.

Не прымае працы чэснай чэзлы люд,
Хваласпеў і пустата балююць тут.
Ды за подласць паквітацца прыйдзе час:
Не мінае ліхадзеяў Божы суд.

Трэба скарб жыццёвы свой не пагубляць,
Вострым розумам і думкаю крыляць.
Ці не сорам па аулах дзень пры дні
Час у жартах ды ў крыўлянні прабаўляць?

Чужы невуку мой розум, ён хутчэй
Верыць глупству, думак высахлы ручэй.
Хіба здатны кожны праўду ацаніць?
Небыліцы верыць дурань — жыць прасцей.

Марыць дурань пра багацце ў галыззё!
Што ў адзенні, срэбрам шытым, — не рыззё.
Ён з пагардаю адносіцца да слоў
Аксакала, хто ў жыцці спазнаў усё.

Мудры зорка пранікае ў сутнасць спраў,
І, што трэба, па паліцах ён расклаў.
Ён асудзіць, ён і ўзважыць нейчы грэх,
Ну а невук тым жыве, што гурт сказаў.

Вораг слова шле прыхільнае яму —
Родных згубіць і аплача. А таму,
Хто спазнае ўдачы дзіўнае святло,
Скажа: «Богу зразумела аднаму!»

Рады горычы народа сыч-шайтан,
Сам Анёл прагнаны хціўцам — блуд і зман.
Цвёрда ведаю — не каецца вампір,
Ён папоўніць сатаны прадажны стан.

Быць жадае ўладаром махляр любы,
Рацъ збірае для паходу зык трубы,
Ды не будзе, здраднік, першым між людзей —
Дол сыры накрые хутка ўздых слабы.

Шлях не кожнаму пад зоркамі відзён.
Хто праўдзівы, той шануе сам закон.
Валасным усё спрабуе стаць махляр, —
Ды праклятым, як сабака, будзе ён.

1886

* * *

Адыходзіць жыццё, убывае — адно.
Дзе ні глянеш — круцельства паўсюд і відно.
Маладое хвалюе мяне пакаленне,
Не хінецца да працы стваральнай яно.

Бай бярэ і гаворыць: «Пабачыш, нідзе,
Калі сплоціш спаўна, не пакіну ў бядзе».
Валасны а ці бій пажывіцца гатовы:
«Так насолім яму — вораг твой прападзе!»

Пазычае бядняк: «Працай я заплачу».
Сотнік: «Чутку-знявагу ў ауле пушчу!»—
Вымагае, аж ходзяць яго жаўлакі:
«Адыду — і не знойдзеш, і след мой прастыне,
Буду дзейнічаць супраць цябе. Я такі!»

А хітрэц не шкадуе напышлівых слоў:
«Расхвалю цябе гэтак, што будзь ты здароў!»
Ён надумаўся ўсё ж бараном пажывіцца.
Як пачуеш — у скроні затахкае кроў!

Што ж, свяжуй барана і частуй ім паўдня.
«Галасуй за мяне, мяса дам я!» Хлусня!
Прыйдуць мігам усе, затрашчаць, як сарокі:
«Хто дасць болей, таму я і друг, і радня!»

Здрадзіць хтосьці — на праўду яму напляваць.
Парушальнікаў клятвы прывыклі трываць.
Вось адзін з іх зноў брэша, як злосны сабака:
«Я кусок адхаплю — і пайду баляваць!»

Ашчаслівіць начальнік акругу сваю:
«Выбірай каго хочаш, свабоду даю».
І ад гэтага многа паўсюд беспарадку.
Кіраўніцтва з пагрозаю: «Знішчу! Заб'ю!»

Застанецца, хто здрадзіў, сам з бруднай душой.
Папракнеш — агрызнецца: «Не ў ласцы з табой!»
Чалавека не бачу, які мне сказаў бы:
«Задаволены доляй шчаслівай сваёй».

Бацьку сын прадае, брата роднага — брат.
Я стаміўся, такому жыццю я не рад.
Калі золату гонар з сумленнем слугуюць,
Вусны змоўкнуць няхай, ім знямець акурат.

Заблудзіліся людзі — і зло ў іх грудзях.
Чыняць здзекі сябрам, цемень стыне ў вачах.
Карысліўцы шукаюць багацця і славы.
Ты навошта стварыў іх такімі, Алах?

Дык праклянцце таму, хто для ўласных выгод
Гонар свой прадае, счэз душою на лёд,
Хто клянецца прылюдна, а потым маною
Здабывае пашану сабе і даход,

Хто у коле сямейным прыстойны, паважны,
Ды гатовы прадаць за драбніцу шчадрот.

1886

* * *

О казахі мае! Мой бедны народ!
Жорсткім вусам няголеным прыкрыты рот.
Кроў — на правай шчацэ, а на левай — тлушч…
Дзе ж тут праўда? Твой розум маўчыць шмат год.

Не паганы, — чуцён славы добрай зык.
Шчыры гойнай душой, не малы на лік.
Ты не хочаш парады мае пачуць,
Рэжа ўсіх без разбору твой серп-язык.

Не ўладарыш адно над сабой самім.
Мы трывожымся днём і кашмары снім.
Ганарысты падчас, а то з крыўдай глядзіш,
Пастаянны ты ў непастаянстве адным.

Усялякі нікчэмны і хіжы зброд
Так знявечыў душу тваю, мой народ.
Дзе надзея на выпраўленне тваё,
Калі долі сваёй не каштуеш плод?

Родзіч з родзічам сварацца з-за драбязы.
Богам розум адняты, адчай слязы.
Ні адзінства, ні веры, паўсюль разлад.
Стала меней тваіх табуноў у разы.

З-за улады і грошай варожасць кіпіць.
Свет гатовыя здрайцы ў крыві ўтапіць.
Калі набрыдзі гэтай не зрынеш, тады
У знямозе і страху табе век жыць.

Хіба можаш ты быць спакойны душой,
Калі глуміцца столькі хамул над табой?
Калі мужнасць сышла, калі цвёрдасць сышла,
Хіба можна расстацца з балеснай журбой?

Калі хто-небудзь верны пакажа шлях,
Ты зняславіш яго ганьбай гучнай і злой.

1886

* * *

Бай жыве і пільнуе статак свой,
Дзесяць дорыць — а сотня брыдзе жывой.
А той, хто здабудзе дзясятак галоў,
З дзевяноста здзярэ шчэ з ухмылкай крывой.
Адзін аднаго зняважаць спярша.
У горад едзе, пап'е вады з Іртыша,
Напіша данос напалову з грахом,
І скача дадому — спявае душа!
Коні схуднелі ад скачкі такой,
Кішэні пустыя — не мацай рукой!
Хоча ўсяведам і хітрым праслыць,
Век ганарыцца павагай людской.
Хто маўчун, то гавораць: «Спужаўся ён!»
Бай спяшаецца сам абмінуць закон.
Махляр біты не раз, ды яшчэ жывы.
У багатага сіла уся здавён.
На сумленнага, каб абняславіць-збіць,
Налятае сабакам — гудзе трызвон.

1886

* * *

У аблуднага, вядома, не шляхі, а горкі дым.
Толькі вузкая сцяжына засталася перад ім.
Ён заўжды высакамерны, як джайран сярод авец,
І такія дзеі чыніць — іх не бачыць бы зусім.

Ходзіць ён павольна-важна, павязаны кушаком,
Дарагі чапан суконны, плеш прыкрыты башлыком,
Малахай свой самы лепшы ён спяшае апрануць,
У пустых гаворках-спрэчках хвацка менціць языком.

Нават летам яго шапка не запыліцца ў кутку,
Гладка струганая палка як падпора хадаку.
Ў керэге ўтыркне ён палку, кіне шапку на яе,
Азіраецца нядбайнік, пазяхае ў халадку.

І штаны яго здарэнняў многа бачылі не раз,
Ён трымаецца за гузік, абдурыць жадае вас.
Быццам птушцы ў цеснай клетцы, тут няма заняцца чым,
Застаецца пустасловіць, выстаўляцца напаказ.

З юні дзён усім ён роўня — сустракайце малайца!
Зубаскаліць, лезе ў бойку, зневажае мудраца.
У размове казырыцца, круціць носам, хмурыць лоб,
Пазірнеш і пасміхнешся: проста певень без званца!

Жаль які, што ў нашым людзе многа ёсць такіх аблуд,
Іх жыццё, што гасне марна, хцівасць хіжая і бруд.
Іх мастацтва — ў тым, што носяць хвацка хітрыя штаны,
А надзённыя турботы — для цябе, згібелы люд!

Так штодня — адны гулянкі, і няма другіх клапот.
Каб аддаць павагу працы, а жыццё — за свой народ?!
Толькі шнырацъ па аулах, хвошчуць плёткай рысакоў,
Не вітаюцца пры стрэчы і з ухмылкай крывяць рот.

1886

* * *

О, юнацтва пара — квет жаданы вясны!
Ды не думай: табе не прыдбаць сівізны.
Толькі ў юныя дні хмеліць нас весялосць,
Ну а старасць прыйшла — вее холад труны.

У юнацтве так лёгка песенькі ўсім распяваць,
Трапным гуллівым слоўцам сэрцайка чараваць.
І да грудзей гарачых зноў прыгажунь хінуць, —
Большага шчасця, мабыць, нельга ўжо і жадаць.

Мудры жыццё такое глупствам жадае назваць —
Лепш табунам ды навукам беглыя дні аддаць.
Дзеўчыну пакахаеш — толькі кахай адну,
Ад перабору ў каханні шчасця табе не знаць.

Ды за скацінай лена моладзь услед брыдзе.
Бавіць жыццё ў гулянках — а значыць, быць бядзе.
Лепей за ўсё ў юнацтве сёння вучыцца нам.
Хто не сумее — ад працы чэснай не прападзе.

Ходзіш зачаста ў госці, марна губляеш дні,
Век гарцаваць гатовы на вараным кані!
Толькі схуднее конь, знікне пашаны след.
Гэты пусты разгул розумам ацані.

Стрыманасць — вось ён, шчыт. П’яны загул — ярмо.
Цяжкасці перамагаць вучыць жыццё само.
Ці ж варта рабом заставацца тлумных, пустых забаў?
Волі адчуй узлёт, ці прытаміўся мо?

Будзе зашмат спакус — прама ступай, не збоч.
Стрэнеш няшчасце ты, страху агорне ноч.

Будзеш, як той жабрак, хлеба прасіць кусок.
Памятай пра другіх, мужна дарогай кроч.

Як жа нявечаць нас пыха і франтаўство.
Мецяць заўжды яны ў вока, а не ў брыво.
Злодзеем можа стаць ці апрануць лахманы
Той, хто сваім мазалём не прывітаў жніво.

Розуму не навучыў бацька нас з юных год,
Вопыту для жыцця не перадаў твой род.
Вось і глядзі — сышла марна твая маладосць,
Рады б разумным стаць, ды паміраць чарод.

Тых юнакоў няма, хто б мяне падтрымаў,
Голас надзей пустых подаўна ўжо сканаў.
Каб аніхто не змог нас, старых, папракнуць,
Простыя словы свае я для другіх пісаў.

1886

* * *

Да ступняў як, скажы, тваіх,
Тварэц, знайсці мне шлях прамы?
Калі сцінае горла кат —
Дрыжу ад ярасці, нямы.
Аргынцам і найманцам, тым
Радкі мае — настой густы,
А для суродзічаў маіх
Іх вешчы сэнс, што гук пусты.
Ім злітак золата даю,
Ды павялося так, што ім
Ён меддзю здасца, залаты,
Падай ім з Самарканда бязь,
І, ёй спакушаныя ўраз,
Яны расстануцца з парчой.
Іх фанабэрства супыні.
Калі ж, Тварэц, туман хлусні
Развееш ты сваёй рукой?
О міласэрнасці Тварэц,
Калі ж вар’ят і лгун-хітрэц
Падуць прад веліччу тваёй?

1886

* * *

Кожны за таварам едзе на базар.
Там гандлюе меднік, пекар і ганчар.
Вам патрэбны жэмчуг, а камусьці — хлеб.
Знойдзецца прыдатны кожнаму тавар.

Кожны тут спатоліць смагу прагных мар,
Кожнаму па сродках дасць сваё базар.
Ды не ўсім даступны жэмчуг слоў маіх,
Не па смаку многім слоў маіх нектар.

Многім не па сэрцы творцы Божы дар,
Не абросіць слова душ пустых папар.
Хай не ўсім да слыху тое, што кажу,
Ды ахопіць слова душы, як пажар.

Паспытай, чытач мой, слоў жывы нектар
І прымі належна мой пакорны дар.
«Жэмчуг не для дурня!» — кажа так мудрэц.
Гэта разумее і халоп, і цар.

1886

* * *

Пакуль не маеш, — маўчы,
Пакуль блукаеш, — маўчы.
Ў бязмэтных днях і ўначы
Дары забаў не лічы.
Каб чалавекам ты быў,
З другімі ўпоравень жыў,
Ты кволасць духу змажы,
Агонь душы зберажы.
Лухта, хлусня і хвальба,
Гультайства, п’янка-гульба —
Пяць грозных ворагаў, знай.
А розум і дабрыня,
Упартасць, праца, любоў —
Яны з надзейных сяброў.
Будзь чыстым, зла пазбягай,
Світанне справай страчай,
Каб розум жыў дабрынёй.
Няхай вучоным не стаў,
Інакшым стаўся лёс твой,
Ды ў смазе ведаў залог
Тваёй дарогі прамой.
Не гавары: «Не змагу».
Да ведаў мкніся душой,
Іх скарбы смела бяры.
Жыць станеш звабай пустой —
Пагасіш іскру ў душы.
Багацце, шчасце, спакой
Дадуць навукі табе,
Святло іх бач прад сабой.
І ўсё, што скажуць з журбой —

Ці аксакал, а ці бай —
Пачуй і сам спасцігай.
Будзь верным думцы жывой.
Не цешся зманнай хвалой!
Адзінай праўдай жыві,
Чым пошласць будзе зычней,
Тым з ёй змаганне лягчэй.
Адметным сціпласцю будзь,
Мой горкі вопыт засвой.
Аб тым, хто кажа табе,
Не думай: «Хто ён, герой?» —
Лепш цешся сутнасцю слоў.
Свет мае шмат песняроў,
Прарокаў і мудрацоў,
Вялікіх справай сваёй.
Сягоння думай аб ёй!
Павер жа слову, юнак,
Не дай свой розум на глум.
Не згубіць розум няўзнак
Спакусаў моташны тлум!
Дайдзі да мэты спаўна —
Маё жаданне адно.
На мудраца — сто дурных,
Вось горкай ісціны дно.
І ведай, юны мой друг:
Не ў словах блізкіх сваіх
Ты знойдзеш праўды агмень.
Даўно ў іх сэрцах патух.
Хлусня там — цемра начы.
Душа — як змрочлівы схоў.
Там шмат бяздумлівых слоў.
Вучыся сам і вучы.
Да ведаў мкне чалавек,
Хай веды ўславяць твой век!
Бо веды — светач жывы.

Не мае вучняў — то ён,
Настаўнік, як удавец.
Людзей па розуме мер —
Заўжды разумнага ўваж,
Шануй у клопатах дзён.
З праўдзівым розумам будзь
У справах, думках сваіх —
Гавораць так мудрацы.
Прымі наказ мудры той,
У тлуме дзён не забудзь,
І будзе ў высі імкнуць
Палёт душы маладой.

1886

ЛЕТА

Летам, калі цяністыя дрэвы,
І бела ад кветак на росных лугах,
І на шырокіх рачных берагах
Качэўе раскінецца на санцагрэве, —
Такія высокія ў стэпе травы,
Што хваляю коціцца ветрык млявы.
Добра наеўшыся, кабыліцы
Не ў сілах, здаецца, паварушыцца:
Ціха стаяць яны ля ракі,
Хвастамі гнюс адганяюць лянiва.
Адно скачуць весела і імкліва
Ля іх жарабяты і стрыгункі.
Гусей і качак зборышчы-зграі
То зноў садзяцца, то зноў узлятаюць…
Смехам і ўскрыкамі асыпаюць
Жанчыны прастор далёка наўкруг,
Ставяць са спрытам юрты лоўка,
Бачны ўпэўненасць і падрыхтоўка
У плаўных рухах іх белых рук.
Бай аб’язджае свае атары,
Сабой і жывёлай давольны зноў.
На статным кані трусіць дамоў
Увагу аддаць пузачу-самавару.
Лье гаспадыня з сабы кумыс,
Спрабуе, ці ў меру на сонцы падкіс,
А хлопчык, прысланы сюды батракамі,
У маці круціцца пад рукамі.
Просіць жалліва: «Мяса дай!»
У ценю навеса гатуюць чай,

І ў чаканцы гарачага чаю,
На кошмах седзячы важна, баі
Вядуць гаворку паміж сабой.
Пакуль адзін, такі гаварлівы,
Трашчыць не змаўкае, другія цярпліва
Ківаюць з пашанаю галавой.
Дзед здрахлелы ў белай кашулі
Крычыць чабанам: «Ганіце авец!»
Марыць аб тым, што бай-удалец
Яго пачастуе — увагай атуліць.
Табуншчыкі на сваіх скакунах
Дарогай імчаць — наладзілі скачкі,
Твары азызлыя, як ад спячкі,
Паясы ўзорныя на чапанах.
Чародка юнцоў з птушкай у полі
Палюе на качак — гарлае-сваволіць,
Калі, з рук выпушчаны, у выш
Беркут імкліва ўзмывае чорны
І шустрага качара схопіць праворна.
Усё, што мінула, агортвае ціш
У памяці хліпкай дзеда сівога.
Ён крочыць ужо сыходнай дарогай,
Прыстаўшы на беразе плыткай ракі,
Вітае юнцоў усмешкаю зорнай.

1886

* * *

Прага ведаў збівала жыццё напавал.
Спахапіўся, ды позна. Вось ён, прывал!
Ведаў мала, а бачыў сябе мудрацом,
І чакаў я заўжды ўзнагарод і пахвал.

Думаў — заўтра адсталыя рушаць за мной,
Ды яны мяне збілі з дарогі прамой.
Я — адзін, а нахабнікаў не палічыць,
Пацяшаюцца хціва пустой гаманой.

Прастадушнаму злосна крычым: «Урус!»
Ды куды нам мілей крывадушны хлус.
Чалавечнасць павыгнаўшы з сэрцаў сваіх,
Рвём сляпым недаверам сяброўскі хаўрус.

Як віхор, уварваўся ў наш дом недавер,
Нават лепшаму сябру не верыш цяпер.
Не даруеш памылак яму. Стыні лёд
Лёг у сэрцы, настойліва кажа: «Не вер!»

Толькі дружба азорыць, як сонца, дні.
Коцяць хвалі любові і дабрыні.
Тое, што мы каханнем і дружбай завём, —
Як для сэрца сілок, што сатканы з хлусні.

Ні сяброў у мяне, ні каханай няма.
Стома легла на сэрца, нібыта зіма.
О, якім неабсяжным здаваўся свет,
Калі сіла жыцця віравала сама!

Дружба — дар Усявышняга, вечны цуд,
Словы сябра з душы тваёй змыюць бруд.
Я сяброўства жадаў, толькі злосны ліхвяр
Задушыў яго ўраз, растаптаў, як хлуд.

Я шукаю сяброўства — нікога вакол.
Клічу сэрца крывёю — магільны дол.
Я прыхільнікаў многіх тут змог адшукаць,
Ды сяброў не сабраў за гасцінны стол!

1886

* * *

Верш — правадыр між слоў, іх найдарожшы ўбор.
Адораны паэт радкі тчэ, як узор,
Дзе пахкасць свежых слоў, дзе сэнсу гушчыня,
Дзе цесна вязі слоў, а ўзлёту дум — прастор.

Бывае, што радок зіхціць, як пустацвет,
І слоў не беражэ няўдачлівы паэт.
З тых, хто вяшчуе ўслых, ці слухае, — ён той,
Каму суладдзе слоў не скажа свой сакрэт.

Спярша Карана верш, а прымаўкі пасля,
І плынь няхітрых слоў віруе спакваля.
Не варта б іх было да Бога прамаўляць,
Бо сутнасць гэтых слоў нікчэмная, як тля.

Хай будзе верш жывым, без слоўнай пустаты,
Хай радуе душу радкоў настой густы.
Ды рэдка здатны хтось свой скласці звонкі верш,
Дзе свежасць трапных слоў, як россып залаты.

Калі згадаць, якім быў верш сівых дзядоў,
То прымавак зашмат ты знойдзеш там між слоў.
Паэты той пары ўсе невукі былі,
Іх думкі вольны лёт нікчэмнасць брала ў схоў.

Пад гукі домбры верш спявалі гучна свой,
Узносілі яго мізэрнаю хвалой.
І згасла ззянне слоў, і страціў верш вагу,
Зрабіўся жабраком з мізэрнаю душой.

І слова, і душа імкнулі да шчадрот —
І нёсся хваласпеў, як звон узнагарод.
Так беднякі заўжды сярод плямён чужых,
Старцуючы ў жыцці, хвалілі ўласны род.

Багаты сябелюб стаў кожнаму, як брат.
Паэт яшчэ не бай, хоць і сабраў зашмат.
Здаюцца і цяпер пустымі вершы іх,
Бо страцілі свой сэнс у шуме хмельных свят.

І не крануты мной іх чэзласці запас,
Паэт, я з-за атар не стану пець, — не час,
Бо іншы у мяне і слоў, і мар узлёт,
І той, хто чуе іх, мне дасць цяпер адказ.

Калі б я пеў аб тых, хто п'е з народа кроў,
Або красе дзяўчат аддаў хвалу радкоў,
Мяне б пачулі ўсе з прытоенай хвалой,
Не бачачы цаны тых легкаважных слоў.

Да розуму дароў не цягнецца народ,
Ён грэбліва глухі да ўсіх яго шчадрот,
Бо лодараў між нас так многа — не злічыць,
Да гэтых слоў маіх — у сэрцах крыўды лёд.

Другія там і тут — без ліку хадакоў —
Да цёпленькіх пасад паўзуць з усіх бакоў.
Ды што ім зразумець, калі з іх хоць адзін
Цямрэчы і маны не збавіцца акоў?

Сумленне, сціпласць, чэсць — усё ў душы маўчыць,
Патрэбнымі ніхто не хоча іх лічыць,
Не прагне ведаў люд і розуму праяў,
Хлусню спрабуе зноў, нібыта воўну, ўзбіць.

1887

* * *

Блізкі памірае — сэрца цісне сум,
Смутна наплывае хмара горкіх дум,
Ды аднойчы ў песню перальецца боль,
І маркота сэрца не аддасць на глум.

Жаніха сустрэнуць, правяць шлюбны той,
Ці па юртах зранку ходзяць з маладой, —
Кнамендзе спяваюць, бет-ашар, жар-жар.
Не квітнець без песні радасці зямной!

Нарадзіўся хтосьці — баль, шыльдзехана,
І ў начы не моўкне тостаў гамана.
Нават прамаўляе словы верша бій, —
Ў песні мудрасць продкаў гучная чутна!

Дзверы адчыніла песня ў свет табе.
І праводзіць песня прах твой у журбе.
Песня — спадарожнік радасці зямной.
Будзь ёй сэрцам верны, не забі ў сабе!

Калі песня словам сэрца не кране,
Калі не спазнаеш — вольны спеў ці не? —
Песні не прапетай заставацца век.
Ды не знікнуць песні ў чэзлай даўніне!

Верш — карункаў ззянне, скарб душы майстроў,
Шчыльна ў ім сабраны спеў суладны слоў,
Калі ў ім дакладны трапнай думкі ўзлёт, —
Не памерці песні, стрэць зашмат сяброў!

Слова не ўсхвалюе сытага скупца,
Сэнс у песні знойдзе сэрца мудраца,
Толькі тым, хто цэніць слова, ты спявай
Ў час, калі адкрыты душы для Тварца.

Не прасі за песню ад людзей зашмат —
Праспяваўшы песню, не панёс жа страт!
Хто гандлюе песняй — тых ты абмінай,
Тым спявай ты песню, хто ёй сэрцам рад.

У натоўпе знойдзеш ты не шмат такіх,
Хто сумее песню ўзяць душой на слых.
Люд завабіць хутка іншы чарадзей —
Мала хто пачуе мудрасць слоў тваіх.

Шортамбай, Бухар-Жырау і Дулат, —
Колькі ў іхніх творах плямінаў і лат!
О, калі б знайшоўся знаўца хоць адзін, —
Мігам тыя хібы адшукаў пагляд!

Мужнай і праўдзівай песню сатварыць,
Каб не толькі вочы — сэрцы ёй адкрыць,
Невуку навуку, юным прыклад даць,
Каб змаглі на свеце па-другому жыць!

1888

ВОСЕНЬ

Хмар паспела вязьмо нагадаць аб сабе,
Гэта восень з дажджамі шыбуе ў журбе.
І астылыя долы, скалеўшы ад сцюж,
Капытамі кабыла дарэмна шкрабе.

Траў не стрэнеш на ўлонні празяблых далін,
Ні дзіцячае радасці ўзлётных хвілін!
Нават дрэвы, што ўсохлі, нібыта дзяды,
Ў неба цягнуць бязлістыя рукі галін.

Зноў дыміцца з авечымі шкурамі чан —
Патрапалася вопратка, ў дзірках чапан.
Правяць-латаюць юрту жанчыны гурмой,
І бабулі сівыя ткуць зыркі дыван.

Клінам шугкім у вырай ляцяць журавы,
Галадаюць вярблюды — не ўзняць галавы.
У маркоце аулы — куды ні ступі,
Не пачуеш вясёлага смеху дзятвы.

Ля астылых цяпельцаў паніклі дзяды,
Моўчкі слухаюць вецер — прадвесце бяды.
Дзесь сабакі блукаюць — палююць мышэй,
Дома костку не кінуць — бяжы хоць куды!

Травы зжухлыя ў стэпе пыл шэры прыб’е,
Зноў дарогі схавае, тугою спаўе.
Будзь пракляты ты, звычай сівой даўніны,
Што раскласці у юртах агонь не дае!

1888

* * *

Зімы прадвесце — лістапад, пара ў аул, сябры!
На летняй пашы зноў грымяць халодныя вятры.
І, каб вакольныя лугі да снегу не таптаць,
Трымае ў стэпе коней бай, а не ў сваім двары.

У бая многа пастухоў і юрта — проста цуд!
А бедны мерзне дзень пры дні — на холадзе паўсюд.
Ён квасіць шкуры, дубіць іх у чане ледзяным,
І жонка тчэ яму чакмень, змарнеўшы ад прастуд.

І для дзяцей няма агню, і ў юрце дух сыры.
Цяпло апошняе сышло, астыла без пары.
Ну а старым — зусім бяда, кладзіся — памірай,
Няма ні ежы, ні цяпла, адно гудуць вятры.

Калі ўжо рэжа быдла бай найгоршае няўзнак,
Дык дзе ж сумее адшукаць цяпло і харч бядняк?
Як дасць багаты паўмяшка сухога кізяку —
Удзячным будзь усёй радні яго за той кізяк!

Няхай над стэпам снегавы буран грыміць-мяце,
Ды байскі сын у цеплыні, як горны мак, цвіце,
А батрачок малы пры ім павінен быць штодня
І са слязамі на вачах гібець у галаце.

Нясмела потым, быццам цень, ён зойдзе ў байскі дом
І спінай зноўку падапрэ гару мяшкоў з дабром,
Украдкай падбярэ кусок, што кінуў байскі сын.
У ціхім лежачы кутку, забудзецца ўміг сном.

А бай нахабнікам сынком давольны, будзь здароў!
На радасць баю той расце сабакам — бацькі кроў!
Сваіх пагодкаў беднякоў саромеецца ён,
Бо сквапнасць злодзея пры ім і хіжасць ад звяроў.

Бай не пасобіць бедаку. Спагада — як мана.
А дасць калі — як сцебане ударам бізуна.
Працуй, бядняк, пазыку ты павернеш з каптуром,
Каб баю жыць і багацець, ну а табе — хана!

Самоты поўнае жыццё галодных бедакоў!
Атар бязлікіх уладар, вярблюдаў і быкоў,
Бай, хіжым сквапнікам не будзь, забойцаю не стань,
Зіму хоць гэту пракармі нямоглых беднякоў.

1888

ЗІМА

У апрацінах белых, з сівой барадой,
Ад нямоты сляпы, з ледзяною душой,
Зледзянелы увесь і суровы на від,
Дзе ні ступіць — пасее страх спудлівы свой.
Подых — стылы мароз, сібер люты і снег,
Сват стары, цэлы свет забярэ ў непакой.

Шапка — воблака белае — збіта набок.
Ад марозу гарыць чырвань свежая шчок.
Бровы — чорныя хмары — над стынню вачэй.
Галавой трасяне — снегам засціцца зрок.
А калі раззлуецца і чмыхне, як вар, —
Шасцікрылае юрты хітнецца шасток.

Безліч з раніцы спраў у цікаўнай дзятвы,
Твар мароз апячэ, схоў рукам — рукавы,
І пастух на халат апранае кажух,
І ад ветру, што ў твар, крочыць ледзьве жывы,
Нават коні, што шляхам памчалі наўскач,
Могуць ледзьве адужаць напор снегавы.

Між раз'ятраных сцюж нема выюць ваўкі,
Аж праймае наскрозь чуты страх трапяткі.
Пастухі сцерагуць пільна статкі свае.
Праганяючы сон неадчэпна-гняткі,
Усё ж лепей, як воўк, Кандыбай і Канай*.
Кляты дзед панясе снег і лёд ў дзве рукі.

1888

---

*Назвы суседніх бедных аулаў.

* * *

Зыркі месяц пакінуў схоў —
Бляску светлага не шкада.
Бліз аула глыбокі роў,
І рачная шуміць вада.

Незлічона вакол лісця —
Шэпт пяшчотны плыве здаля.
Зноў павернута да жыцця
Ў зеляніне густой зямля.

Адгукаецца рэха з гор
Гукам горнай красы начной.
Ці ж не ты тут, было, замёр
У чаканні яе адной?

Страх нясходны хлапечы свой
Піў пад месяцам залатым,
Халадзеў ад свавольных мрой,
Што плылі, як світальны дым.

Стыла ў горле бязгучча слоў,
Толькі сэрца яе і чуў,
І, не верачы яве, зноў,
Да грудзей яе ўсё хінуў.

1888

* * *

Ў грудзях маіх памёр давер…
Каго сустрэну — ўсім даводжу:
«Быў сябар — вораг мне цяпер…»
Што я зрабіў такое, Божа?!
Ты ў доме — горная рака:
Грыміш няспынна і сурова.
А прад чужым прамовіць слова —
Нямы, нібы без языка.

Ці быў падобным ты раней,
І што, батыр, з табою стала?
На дзень які аркан вальней —
І ярасць прытка паскакала.
Калі нядобра зноў усім,
Ты пасміхаешся прачула.
Бяда сышла і не сагнула —
Халодны зноў, як сцюжы зім.

Калі ж здабыць або адняць —
Непераўзыдзены хапуга!
Сам хмурышся, як трэба даць,
Бярэш, бы вузел вяжаш туга.
На пасядзелцы ў балбатні
Ты чыніш сотням звад разборкі.
І ў рэшце рэшт успыхнеш, жорсткі, —
Зачын крывавае разні.

Дзвярмі не ляскай сам не свой —
Яшчэ надарыцца вярнуцца
(Калі з бядой не размінуцца)
Часінай горкаю зямной.

1889

* * *

Вось абраны я валасным.
Колькі хабару даў — не злічыў!
І вярблюды ўжо без гарбоў,
І няма больш у коней грыў.
Хоць і многа патраціў я,
Як людзьмі кіраваць — забыў.
Скажа слова улада мне —
З ёй заўсёды я ў згодзе жыў.
Калі ж з просьбай ідзе бядняк —
Між вушэй яе прапусціў.
Пасміхаюся хітра я,
Каб мой страх хоць хто не ўлавіў.

Неяк крочыў аулам я, —
З весткай нарачны ля варот:
Павятовы ў дарозе ўжо,
Сабярэ ён на сход народ!
Небагата да сходу дзён,
Страх працяў мяне навылёт.
Мітусіцца пачаў тут я
Ад навалы дурных клапот.
Усіх баяў сабраў, старшын:
«Скача госць… Не глядзіце ў рот!
Падрыхтуйце жыллё, ачаг,
Не шкадуйце дароў-шчадрот…»
Выхваляюся прад людзьмі:
«Не зазнаеце больш нягод,
Апраўдаю з ліхвой давер,
Не шукаю сабе выгод.
Каб пазбавіць ад гора вас,
Ці ж не мучуся круглы год?»

З павятовым удвух сяджу
І народ дакараю свой.
А народу пасля кажу:
«За цябе я стаю гарой!»
Люд бясконца за нос ваджу:
«Толькі й раіцца ён са мной…»
І пры гэтай сваёй хвальбе
Сам міргаю: «Вось я — герой!»

Пена чутак бурліць наўкруг —
«Корміць нас валасны лухтой!»
Горка біты хвалько і хлус,
Хто люд цешыў маной пустой.
Пасля спрэчак прагналі тых,
Хто прыйшоў сюды з думкай злой,
А нахабнікаў-непакор
Захліснулі тугой пятлёй…
Гаварылі на сходзе зноў
Аб вялікай крыўдзе людской, —
Бій пабачыў: злаваць людзей
Хіба можна ганьбай такой?
І скаціну, што раньш адняў,
Павярнуў жа сваёй рукой.

Даўжнікі ўпершыню тады
Ад палёгкі змаглі ўздыхнуць…
Ходзяць скаржнікі — іх натоўп,
Скаргі ўсюды штодня чутны,
Нават скурчыўся валасны:
«Мне ад клопатаў не заснуць!
З ранку я да начной пары
Ўперад мчуся, а то назад,
Развяваецца конскі хвост,
Расцягнуўся на мне халат,
Павятовы каб бачыў плён,

Я служыць яго волі рад:
Рассыпаю удары скрозь —
Уцякаюць і сват і брат.»
Шалахвосты і крыкуны
Больш рахманыя за цялят.
Пуза млее, сухотны ўзвей…
Мне каўнер расшпіліць акурат.

Валасныя суседніх сёл,
Дзе згаворліва людзі маўчаць,
Чыняць здзек, ушчуваюць мяне,
Галасы іх зычна гучаць.
Словы іх, быццам хвалі ракі,
Несупынныя, як вадаспад.
З павятовым заводзяць толк —
Справы тут жа ідуць на лад!
У мяне ж упарты народ —
І начальства нядобры пагляд,
Я сціраю падэшвы дарма,
Кожны хоча падкінуць парад…

Я, магчыма, пракляты які
Ці з няўдаліцаў і гуляк?
Хоць і трэба больш сціплым быць —
Не прымушу сябе ніяк!
Пасля сходу сваіх людзей
Я не цісну ўжо крэпка так,
Перад дужымі прамаўчу —
Не такі ўжо і я прастак,
Калі хто нездаволены мной,
Дык апошні ў сяле бядняк…
Ды бываю вады цішэй —
Не прамоўлю свайго няўзнак!
Там навошта рызыкаваць,
Дзе здабычы ўсяго — пусцяк!

Не журу анікога дарма,
Не сцінаюцца пальцы ў кулак,
А людзей за сябе стаяць
Пераконваю я ўсяляк,
На зачыншчыкаў не крычу:
Бачце ўсе, які я дабрак!

Кіраваць стала цяжка мне:
Рукі ныюць, баляць бакі.
Ўлада, пропадам прападзі,
Ты забрала мяне ў ціскі!
І адкуль дапамозе прыйсці?
Тут разбойнікі, спрытнякі.
Дзе ж сумленне тут зберажэш,
Калі людзі, як вахлакі?
Будзе новы сход — ты, Гасподзь,
Мне пакінь несці крыж цяжкі!
Каб не ўздумалі прыгадаць
Мне былыя мае дзянькі…

Мой дарадца, мяне ўратуй,
Слова мудрае сей з рукі!
Колькі турмаў цяпер у нас!
Шэпчуць скрозь пра мае грашкі.
Нікудышны правіцель я —
Знаюць старцы і дзецюкі.
Дык навошта ва ўладу лез,
Так напорыста, нацянькі?..
Чутку нейкую давядуць
Павятоваму землякі, —
«Ох, ён скажа, навошта ты!»
Не ўцячэш ад яго рукі…
Ганьбу здатны наклікаць ён,
Што як полымя языкі…
Колькі скаргаў ты ні пішы, —
Сам не зломіш турмы замкі!

Мне не стала цяпер жыцця,
Разарваўся пуціны цуг.
Той, хто скаргу патайна шле,
Быццам злодзей, глядзіць наўкруг,
Бо яго пагубіць навек
Здатна справа уласных рук.
Скажуць: поўны хлусні данос
І згібее ў турме ад мук.
Пракурор — паслугач маны,
Не адзін ім пасаджан друг,
Для таго, каб сысці ў турму,
Мець не трэба падчас заслуг!

1889

* * *

Кіраўнік наш начальству рад,
Шчасце ўзносіць гушканкай хваль,
Калі рускі падасць халат
І на грудзі цяжкі медаль.

Ды не вечна ў пашане той,
Хто начальства заўжды любіў.
Блісне бляшкаю залатой,
А сумленне — навек згубіў.

То, як курыца, то арол,
Чуе выгаду за вярсту.
За сяброўскі сядае стол,
Выгляд важны — нясе лухту.

Ім зарэзаны быў баран,
Калі вестку прывёз ганец.
Толькі ў хціўца інакшы план:
Ён малюе ўсяму канец!

Дзе аб поспехах шмат размоў,
Ён займае належны бок.
Як бяздумны дзіцёнак, зноў
Атрымае ён свой кусок.

У каго ж светлы розум ёсць,
Той пагодзіцца ўсё ж са мной:
Гонар ён размяняў на злосць,
Сумна хваліцца галізной.

Як дзяўчына, згінае стан,
За крысо цябе зноў скубе:
Гучна цешыцца, што капкан
Для другіх, а не для цябе.

Ці ж магчыма ад пустаты
Стаць за іншага разумней?
Маеш розум — далей будзь ты
Ад пыхлівых, пустых людзей.

Не навучыш такіх пецярых,
Як дзясятак дабавяць яшчэ.
Няма дрэннага ў справах тваіх,
Калі сорам душу не пячэ.

Хтось сцвярджае: «Дабіўся ўсяго!»
Галаву ганарліва нясе.
Так і бліскаюць вочы яго,
Так і хоча, каб бачылі ўсе!

Хай! Свіння — гэта толькі свіння.
Не баюся паклёпаў пустых.
Ганарліўцаў пацешыць хлусня,
Ды навука зыначыць і іх.

З ганарліўца карысці няма,
Атрымае пасля ўсё адно,
Як ні дыхала б пыха сама,
Тое, што заслужыў ён даўно.

1889

* * *

Хай будзе слова мудраца
Набыткам светлым удальца.
Каб бачыць ісціны святло,
Ўзірайся сэрцам малайца!

Хто поўніць сэрца светлынёй,
Той зразумее клопат мой.
Хто поўны дум і бляску мрой,
Спасцігне праўду да канца.

Пустая дурня галава.
І што ёй мудрасць? — трын-трава!
Цікуе дурань з-пад брыва,
Пачуўшы мудрасці ганца.

Яму прыемней балбатня,
Цябе турбуе ён штодня.
А што ні робіць — мітусня
На розум кволага юнца.

Шукае, як дзіцё, уцех,
Бясконцы глум — ягоны грэх,
Яму ўсё жартачкі ды смех, —
Іржэ гучней за жарабца.

Ў бяздум'і морыцца сваім,
І да ўсяго глухі зусім,
І толькі слухае пры тым
Пра дзеўчыну і храбраца.

Спявай таму, хто сам з душой,
Бо ён ацэніць голас твой,
Падорыць радасць і настрой, —
Мілей алмазнага вянца!

Што дурням слоў жывая вязь?
Ім толькі б хітрыкі ды гразь.
Ім усё роўна — плюш ці бязь…
Аслу ўсяго — падай сянца!

1889

ВАСЬМІРАДКОЎІ

Далёка вядзе,
Ад сэрца ідзе,
Хвалюе душу і цела
І так, як джыгіт,
Паказвае спрыт,
Арканіць здабычу ўмела.
Багатая, дужая мовы бруя,
Спазнаць гэту моц павінен я!

Не здатны разец
Ці спіцы канец
Прыдумаць узор дзівосны;
Карал бы ўзяць нам,
Ды ён — толькі хлам
Для цёмных вачэй зайздросных.
Ты, мова, багацця ў сваіх не губляй,
Глушэц не пачуе твой спеўны грай.

Хто розум згубіў,
Той мар не набыў —
Зрывае зазнайства кветкі,
Халоп слоў чужых,
Гатоў чуць другіх —
У невука звычай гэткі.
Як кволае сэрца, а думка без воч,
Тады лепш маўчы, другіх не суроч.

Аж кроў ускіпіць,
Калі хлус сіпіць, —
Дарэмна даеш парады:

«Саромеўся б хоць,
Каб глум пабароць!» —
Не чуе цябе, не рады.
Хто з ранішніх дзён збыў гонар за сон,
Парад не пачуе, засне зноўку ён.

Малы і стары,
Хто плётак майстры,
Дзе ступіць — паўсюд іх сее.
Не здатны лайдак
Уцяміць ніяк,
Брат брата не разумее.
Адно балабоняць ды чыняць ману.
Ты ведаеш невукам гэтым цану!

Адну за другой
Льюць плёткі ракой
І ў тым весялосць знаходзяць:
Ўсім ямы капаць!
Не могуць і спаць,
Зласліва сваё даводзяць.
Хлусня цераз край з кожнага б'е.
Дык пасвілі лепш бы атары свае!

Шлях слаўны абраў —
Знайдзі безліч спраў,
Працуй, не шкадуючы сілы.
А моташны тлум
Нясе толькі глум —
Няўжо табе гэткі мілы?
Ты працай падзённа сталюй свой быт, —
І, сыты, тады не заплачаш наўзрыд.

Вучыся араць
І быдла прадаць —
Хай працы вядзе патрэба.

Табе у жыцці
І шчасце знайсці, —
Не толькі кавалак хлеба.
Як дружбу цаніць не будзеш, казах,
Утопіш удачу ў гаручых слязах.

Табун даглядай,
Разлад адганяй,
Заўсёды знаходзь разуменне.
Хай праўды святло
Павыганіць зло,
Павырве насілля карэнне!
Сумленне тваё хай пазбавіцца сну,
Парад маіх горкіх спазнае цану!

Інакш хочаш жыць,
Лянота рабіць —
Разбэшчанасць бачу ў гэтым;
Ахвотнік да звад,
Ты сееш разлад,
Забыты людзьмі і светам.
Ці плётак яшчэ не відна гара?
Пакаяцца ў іх не прыйшла пара?

Хто вучыць, скажы,
Купацца ў ілжы
І боўтацца век без справы?
Наступіць твой скон, —
Тварэц, нават ён,
Не кіне пагляд ласкавы.
А звычкі твае, якім ты ці рад,
Самога ж цябе пакараюць, як кат.

Не цела — душа
Ганьбу галыша,
Пакуты твае хавае.

Мне сумна, казах,
Душа ўся ў слязах, —
Над доляй тваёй рыдае.
Жыццё не спаткае турбот нідзе,
Ды многіх яно да цемры вядзе.

Жар сэрца пагас,
Сіл збыты запас,
А мэта — о як далёка!
На сэрцы цяжар,
Пагас яго жар, —
Ці ж можна не чуць прарока?
Ці тое далі мы ў дарогу сынам,
З якое ніколі не збочыць нам?

Бяссільны баец:
Асіліць хітрэц
І сотню сяброў Абая;
Ўжо бель барады,
Не тыя гады,
І кайстра парад — пустая.
Бязрадасны шлях па зямлі прайшоў,
Не многіх для працы супольнай знайшоў.

І вучаны бай,
І хлус-краснабай
Ўпіваюцца гучна славай,
Хаваюць страх свой,
Віюцца змяёй,
Пуцінай ідуць крывавай.
Даб'юць, калі ты пад цяжарам злёг,
Хвалой узнясуць, калі выстаяць змог!

Няхай просты люд
Гібее, як склюд, —
А ты ж не жывеш трывожна?

Ідзеш за гурбой,
А люд — за табой…
Не ўсочыш, відаць, за кожным:
Распусніца-жонка не будзе адна,
І мужа правесці сумее яна.

Не справішся з ёй,
І ўжо — не герой,
Каўтаць будзеш горкі сорам;
Сяброў шмат былых
Заходзіцца ўслых, —
Яхідна ўзвываюць хорам.
Бо чорная кроў у жылах гудзе,
У сорам з іх кожны цябе ўвядзе.

Сяброў не заві,
Ў гразі і ў крыві
Ліслівіш багатым, іх жонкам;
А ўдараць — ўстаеш
І зноўку ідзеш,
З паклонам вядзеш гамонку.
І дзе ж тут сумленню і гонару быць,
Калі ты іначай не ўмееш жыць?

Забрэша сабака,
І тут жа — падзяка:
Узносіць хлапчук дубіну.
А бацька над ім:
«Здурэў жа зусім!» —
І дасць аплявуху сыну.
І ты ўсіх трымаць прывык пад пятой,
Такі ж крывадушнік, як бацька той.

Шлях светлы адкрыць
Таму, хто не спіць,
Хто вечна шукае справу.

А невук-сляпак
Сядзіць проста так,
І ўсё яму нецікава.
Паэту ні той, ні другі не з радні.
Ды ўсё ж пережыў Абай сумныя дні.

Я ведаў жадаў
І даль выглядаў
Заўсёды налева, направа;
Ды кліч мой чужы
Для тых, хто ў ілжы
Пагразі і жыве нецікава.
Усё ж, калі чуеш сілы свае,
Сумленне забыць іх табе не дае.

Іду на уцёс
І клічу свой лёс, —
І рэха ляціць заходу.
Пачуўшы адказ,
Шукаю штораз
Падтрымкі ўласнага роду.
Ды скрытая далеч — маўчыць уцёс,
Не ведае ён ні смутку, ні слёз.

Сышоў пілігрым,
Мкне вершнік за ім, —
Каго покліч мой заманіць?
Стамлёны хадой
Стаю, сам не свой,
І вочы сляза туманіць.
Нямнога займеў я ў жыцці удач,
Як цяжка стрымаць безнадзейны плач.

Пух лёгкіх пярын
Не дорыць спачын,
Не сплю… А натоўп і сёння

Спяшаецца жыць —
Кудысьці бяжыць
У вечным сваім трызвоне.
І тое ж зладзейства, і той жа зман
Гудуць дзень пры дні, як парожні збан.

Праносяцца дні…
Хапае радні
Паўсюль. Ёсць і дом, і дзеці.
Не трэба маны —
Ўсё ж, сэрца, адны
З табой мы на белым свеце!
Курган ёсць у стэпе — магільны знак,
Каштую адзін горкай праўды смак.

1889

* * *

Калі ў душы гарыць святло,
Я да яе узношу кліч.
Калі сутонне там лягло,
То ўсё адно, дабра не зыч.
Калі бяльмо закрыла зрок,
Памрэш, аслеплены, як сыч…
Хай моліцца штодня імам —
За ім ты Госпада ўзвяліч!
Каму дарогі не знайсці,
Таму свайго святла пазыч.

Падобны возеру народ,
Калі крыляе шчасця зніч.
Лісцё калышацца наўкруг
І просіць вецер — паказыч!
Бягуць вясёла раўчукі, —
Вясна, жыві — шумі, курлыч!
Атары выйдуць на лугі,
Забыўшы зім галодны біч.

Той, хто ў варожасці жыве, —
Як пераломлены куліч.
Яго не ўзносіцца душа,
Сцінае грудзі параліч,
Мінаеш горны перавал —
Ўспамінам сілы павяліч.
І на чужыне, дзе б ні быў,
З бядой не стрэнешся ўсутыч.

Нас на адзінкі і нулі
Дзяліць умее нейкі лыч.

«Што без адзінак тых нулі?» —
«Мудрэц» пыхлівы, не талдыч!
Ты кажаш: «Без адзінак тых
Жыві у беднасці, век хныч».
Лухта! З’яднаны мой народ,
Чужы варожасці — не дзіч!
Дык будзь адважны і жыццё
Сапраўднай мужнасцю ўзвяліч!

1889

* * *

Вершаў я не пішу для пацех пустых,
Каб паболей сабраць небыліц былых,
Я пішу, каб радком хоць чаму вучыць
Маладых, хто такі, як і сам паэт.
Верхагляду радкоў маіх не ацаніць,
Толькі чуйнаму сэрцу адкрыць сакрэт.

Слухай смела, ды будзь прастадушным сам.
Сэнс ці знойдзеш? Спярша не паверыш радкам,
Бо з дзяцінства падобных не чуў ты слоў.
Напачатку ці зможаш пачуць мяне?
Ды дзіўлюся, што сэнс ты усё ж знайшоў.
І гаворыш: «Спявай, сэрца верш кране!»

Мае песні іслам праслаўляць не маглі,
Ні дракона, ні дзевы з касой да зямлі.
Я праклёнаў радкамі не шлю дзядам,
Не псую маладых бяседай сваёй.
Калі мова мая беднай бачыцца вам,
Зразумееце потым сэнс, стоены ў ёй.

У багатых сыны — толькі пыхай чутны,
Нам не ведаць бы іх, бо нікчэмнасць яны.
Бо заўважана: той, хто крыкун-пустаслоў,
Ўсё ж не здатны агонь пачуцця здабываць.
Зубаскал і лайдак мае розум аслоў,
Гучна цешыцца ўслых, не прывык працаваць.

Брат, з умельствам валодаеш словам сваім,
Пустаты пазбягай, да людзей ідучы,
Ў ёй карысці няма ні табе, ні другім.
Мы павінны мастацтва сваё зберагчы.

1889

* * *

Востры розум чысцюткі, як пласт ледзяны.
Ў непакорлівым сэрцы — жаданні адны.
Там цярплівую думку і пылкую страсць
Воля ў сілах адняць у пажаднай маны.

Той, хто сэрца і розум воляй скуе,
Здатны будзе ўзысці на вяршыні свае.
Тыя якасці ўсё-ткі не варты граша
Паасобна — любая з дарогі саб'е.

Што без волі і страсці — розуму зрок?
Неразумнаму сэрцу — і поўдзень, як змрок.
Разнамоўе траіх ты змажы паяднаць,
Гэтак вучыць жыццё нас, дае свой урок.

1889

* * *

Дзве дарогі — каханне і страсць — прада мной.
Пожадзь плоццю ўладарыць маёй зямной.
Ды цябе я кахаю, шчаслівай будзь,
Хай загіну я, згіну ў смузе начной.

Ты — мой розум! Я тое даўно спасціг.
Без цябе змрочна ў сэрцы і думках маіх.
Людзі — многіх кахаюць, на ўласны густ,
Для мяне ты — адна, і мілей другіх.

Я — твой раб, о каханне! Трызню і сню…
Ёй адзінай аддам душы дабрыню.
Адлятае надзея — і стыне душа,
Прыляціць — і ў сэрцы патокі агню.

1889

* * *

Які ж мяне чакае лёс?
Сыходзіш,
Кінуўшы пагляд,
Дзе толькі зман
Блішчыць, бы яд,
Мяне прыняўшы
Не ўсур'ёз.

Навошта мучыш ты мяне?
Забыты муж, —
Свабодна руш
Шукаць другіх
Сярод чужых,
Каб чуць,
Як сэрца боль кране.

Зірні — душа мая ў агні…
Крычу — мяне
Боль тузане,
Працяла полымя наскрозь.
Кідаюся —
Загнаны лось,
Лічу жыцця астачу — дні.

Хто ў будучыню зазірне?
Наступіць ён,
Суровы скон,
Злічыўшы ўраз астачу дзён.
Яшчэ душы
Агонь тушы,
Ды вось — другі на змену мне.

Нялёгкі ён, кахання плён.
Здабыў — жывеш,
А не — дык дзе ж?
Жыццё ўсё з мар,
Як неба з хмар.
Ці я хаця б
Іду ў твой сон?

Адно — гняткі смяротны сум.
Няма больш сіл
У кволых крыл,
І сёння ўжо ў маіх вачах
Смяротны зноў
Стаіўся страх.
Ну што ж? Сышло жыццё на глум.

А сэрца вернае — яно
Вядзе паход
Багата год,
Не перадумае уміг,
Не азірнецца
На другіх,
Памрэ за слова нат адно.

Разумны вынесі прысуд,
Утры мае іскрыны слёз
І не кажы мне, што не лёс.
Увойдзеш ты
У дом пусты,
Не папікну —
Як змрочна тут!

О, як кахаю! Сам не свой.
Ды не скажу ні слова ўсё ж,
Як вернешся. Не патрывож
Таго, чаму шаптаў праклён.

Я слоў не вымаўлю,
Ў іх — стогн,
Стаю з паніклай галавой.

Твой позірк мне ні разу
Не падарыў агню.
Ты не прыйшла. І цішыню
Не калыхнуў парыўны крок.
Гляджу праз час услед
Здалёк.
Бывай… У далі веснавой…

Не, не кахаеш ты мяне.
Святлом жывых тваіх вачэй
І беллю вабнаю плячэй
Мне даў Алах залюбавацца
У мроях толькі.
Заставацца
Табе — у светлай даўніне.

Пусціла ты ў мяне стралу
Сляпую, — гэта судны час.
Ды знай: у лёсе кожны з нас
Не вольны. Твой няверны ход —
Як справядлівасці сыход.
Не ўчуе даравання ён
І ў дзень, дзе смерць сатчэ імглу!

1889

* * *

Вітаю ўзлёт танюткіх броў.
Ты ўся — пяшчота і любоў!

Калі сумую па табе —
За цэлы свет ісці гатоў.

Ты лепш за ўсіх, бо шмат гадоў
Ратуеш свет ад халадоў;

Табе я сэрца аддаю —
У вершы вобраз твой прыйшоў.

Няхай сустрэну сто вятроў, —
Мне не абраць другіх шляхоў;

Жывеш у сэрцы ты маім,
Знайшоўшы ў снах таемны схоў.

Ні ворагаў, ні плеткароў
Шаптанне ў цішы вечароў

Ва мне не можа астудзіць
Красы тваёй, што — дар багоў.

На цесным ложы хоць на міг
К агню прыпасці губ тваіх.

Кос удыхаць зноў пах п'янкі,
Грудзей маленькіх і тугіх.

У глыбіні вачэй сухіх
Убачыць страсць, глядзецца ў іх

І разумець, што ты адна,
Што больш няма такіх другіх.

Табой насыціцца б спаўна!
Я, захмялелы без віна,

Зноў заміраю — гэта сон!
Твая краса багам відна.

Мы разам… Юрты мала нам…
Ды ты не тут, а недзе там…

Усё ж я — сокал, і цябе
Насцігну ўміг, на злом вятрам.

Хоць сквапнасці не маю сам,
Ды ў рукі іншых — не аддам.

Ты мне бліжэй і даражэй,
Душы маёй — жывы бальзам!

Прыйдзі, каханая, хутчэй, —
Святлынь зямных маіх начэй,

Мне б прыхінуцца, зазірнуць
Ў гарачы змрок тваіх вачэй!

1889

* * *

Ты змог пяшчотай адарыць,
Душу і сэрца пакарыць,
Сам вырашай каханай лёс, —
Мне без цябе і дня не жыць.

Падліз упартых пазабыць,
Іх слоў не чуць, душой не стыць, —
Ты зможаш мне такое даць.
Ці ж я магу не згоднай быць?

Шапнеш мне слова ў цішыні,
І я — што масла на агні.
Які ў грудзях маіх пажар!
Якая прага вышыні!

Памчыш з сабою на кані —
Падорыш крылы дабрыні.
А пойдзеш — шчасце згасне ўраз
І стануць хмурымі ўсе дні.

Адразу літасць аб'яві:
Мяне на слове не лаві,
Не спакушай, не прыніжай,
Насмешкай хцівай не гняві.

Маё жыццё лепш абарві —
Жар патушы ў маёй крыві,
Лягчэй памерці мне, як быць
З другім на ложы без любві.

О дзёрзкі сокал баявы,
Цікуеш-сочыш з сінявы!
Нямала юных чараўніц
Пагляд твой ловяць агнявы.

Калі ж ты мой, як дзень жывы,
То не кідай пагляд крывы,
Ты — белы сокал, я — фазан.
Бяры! — не знесці галавы.

Цішэй вады, ніжэй травы, —
Так, як чарот берагавы,
Ў тваіх абдымках я трымчу,
Гару, нібы ад крапівы.

Адказ абдумала я свой, —
Ён лёс разгорне, як сувой,
Ты словы простыя прымі,
Адчуй іх сэрцам і душой.

Хай кожны — старац і герой —
Адчуюць слоў маіх настрой,
Ім скласці песню і крануць
Жывыя сэрцы песняй той.

І словы песні залатой
Хай радасцю, а не бядой
Гучаць для ўсіх, хто пакахаў
Жыцця парою маладой.

1889

* * *

Кос чарнеча ляжыць уздоўж гнуткай спіны,
І парыўныя крокі, як вецер, чутны.
Позірк карых вачэй як хвалюе мяне!
Прыгажосці такой свет не мае цаны!

Прыгажосцю такой упіваецца зрок,
Льецца ў сэрца яна, як праменны паток.
Што за голас! Усмешка! Плячэй белата!
Хто зраўняецца з ёй? Ўсе саступяць убок.

Ножкі лёгкае спрыт, вусны — гроны калін.
Ты другой не шукай між паўднёвых краін.
І здаецца мне: бачыў аднойчы ужо
Гэты яблык даспелы з казахскіх далін.

Калі пальцы крануць яе локаць знарок,
Сэрца ўчуе крыві найсалодшы штуршок,
Схіліш твар да яе — і гарачая страсць
Разальецца ў грудзях, узнясе да аблок.

1889

* * *

Сябра стойкага між людзей
Не спаткаеш — не тыя дні!
Ён на выгляд — як ліхадзей,
Сее плёткі, жыве ў хлусні.

Дабрыні ты яго не вер,
Сэрца помста здавён шкрабе.
А памылішся — быццам звер,
Ён накінецца на цябе.

Ён пра вернасць балбоча зноў,
Словы сее, як дробны мак.
Не забудзь — ён мішэнь знайшоў
І патрапіць, стралок, няўзнак.

Я жыццё ўсё надзеяй жыў,
Верыў — светлае ў людзях ёсць.
Я нямала дабра зрабіў,
А ў адказ чуў заўсёды злосць.

Не шапчы свой услед праклён
На асколках пагаслых мар.
У людзей так ужо здавён:
Друг, як вораг, рыхтуе ўдар.

Шлях бясслаўны іх на зямлі
І закуты у змрок густы.
Ці прывецяць хаця б калі
Праўдалюбаў такіх, як ты?

1889

* * *

Дзе ж запал юнацкі пачуцця?
Не ўсхвалюеш — іншым не зайздросць!
Я спазнаў прамудрасці жыцця,
Разгадаць не здолеў прыгажосць.

Знаў цану нікчэмлівай хлусні,
Не стараўся лішне добрым быць.
У абрыдлай дзённай мітусні
Без памкнення шчасце не здабыць.

Радасцей не зведаўшы зямных,
Распазнаць святло ці здатны вы?
Выстаіць на халадах скразных
Той, хто не шкадуе галавы.

Вобраз сябра ў сэрцы пранясеш,
Хто з табой ў бядзе і барацьбе.
Калі сам скаціну не пасеш,
Хто ж яе прыгоніць да цябе?

Свайго лёсу сам ты гаспадар,
Праца — радасць, а лянота — біч.
Пыха, злосць — цямрэчы хіжы дар,
Лепш запасы ведаў павяліч.

Сёння трэба ведаць гэта ўсім:
Хто жыве без мэты, без турбот —
Застанецца пад канец ні з чым,
Не ўпадзе нішто само у рот.

1889

* * *

Даўно ў душы вясновы квет панік, —
Хай блісне сонца, ззяе маладзік.
Цябе адну кахаю ў гэтым свеце,
А ты згубіла закаханым лік.

Каханай кожным словам даражу,
А здрадзіць мне — яе не асуджу,
І ўжо, калі з мяне смяяцца стане, —
Маўчы! — я сэрцу ўласнаму скажу.

1890

* * *

Тулпара не абгоніць просты конь,
Няхай і будзе з выгляду — агонь!
І як мяне б зладзеі ні чарнілі,
Не пасівее ад знявагі скронь.

Ваўка сабаку ў пушчы не дагнаць.
Бог дапаможа здужаць здрайцаў рацъ.
І хоць не раз іх на ланцуг вязалі,
Сабакам звычна гаўкаць і гірчаць.

Вар'юююцца з натоўпам «мудрацы»,
Паклёпнікі-чыноўнікі, купцы —
Сябры іх. І надзейную апору
Знайсці ў Сямеі хочуць, хітрацы.

1890

* * *

Не прадыхнуць,
Грудзі мне скуць
Гора змагло да ўсяго.
Зла не суняць,
Сорам глытаць,
Не расказаць пра яго.

Сэрца шчыміць,
Не саступіць —
Не разупэўніць людзей.
Бо, як хлапчук,
Сэрца ўчуў стук,
Счэз ад пакут і падзей.

Хмарыва дзён…
Ежа і сон —
Мне не патрэбны яны.
Цемра — зіма…
Сіл больш няма
Духам імкнуць да вясны.

Праведна жыў,
Люду служыў,
Рукі мае ў мазалях.
Бог, не забудзь,
Ласкавы будзь,
Выведзь з цямрэчы на шлях!

Сыпле ліствой,
Юнай, жывой, —
Вецер таполю абтрос.

Дрэнны мой стан,
Мокры чапан
Зноў ад удушлівых слёз.

Гордым я быў,
Гора забыў,
Сэрца балесна гудзе.
Горычна мне,
Болем кальне —
Шчасця нябачна нідзе.

1890

* * *

Жыццё пуцінаю вадзіла.
І засталося што? — магіла.
Ды мой язык — з надзейных слуг.
І словы, як прыпар без мух,
Ды мой слухач зусім аглух —
Падобным доля надзяліла!

І вось дажыў да сівізны,
Я словы плёў надзейным ладам.
Ці ёсць на свеце — дзе яны? —
Хто ўдзячны быў маім парадам.
Ішоў пуцінаю быцця,
Здзіўляўся свету, як дзіця,
І ўжо ўзыходжу на вяршыню.
Так рух спыні і пазірні
На шыр зямную з вышыні, —
Падобны свет наш на пустыню!

Каб скруха ношай не была,
Каб у тупік не завяла,
Душа, павінна страпянуцца.
Як птушаня, на свет зірнуць,
Парыўна крыламі ўзмахнуць,
Да зор высокіх дакрануцца!

Як сэрцу гора ўсё ж змагчы?
У цяжкім сэрцы слоў — злічы!
Трывогу чуе і ўначы!
Душа ўсё выплакаць гатова.
Саспеў ужо самоты плод,
Ў грудзях агонь растопіць лёд —
У сэрцы варухнецца слова!

Без ліку невукаў. Не мар —
Над імі ты не валадар.
Як з несумленнымі спрачацца?
Зазнайства сверб адолеў іх.
Паток хлусні дасюль не сціх.
Ды страх не кожнага насціг, —
Яго вар'яты не баяцца!

Дурных да рук прыбраць? — наўрад!
Шкада сысці за далягляд,
Душу мне труціць смутку яд
І да высотаў цягне горных.
Не шкадаваў мяне Тварэц,
Мне здзекі чыніць кожны спец,
Я адзінокі ўсё ж плывец.
Дык, значыць, быць сярод пакорных!

Маё найменне — чалавек!
Ды славы не прыдбаць павек, —
Нядобры сказ паўзе паўсюд,
Дзе ступіш — здзекліва змяіцца.
Вітаеш вершам просты люд?
З натоўпам ты не можаш зліцца!
Спакоем лепш не ахвяруй.
Ды не, Тварэц жыцця, даруй, —
Не здатны ў сценах зачыніцца.

Калі ад жонкі грэшнай ты
Штодзённа чуеш мех лухты,
Гнеў рэўнасны ўскіпіць густы?
Ці ведаеш, на што рашыцца?
А жыць цяжэй усё… Мільгне —
Такое ж самае ўва мне
Зняменне: жыць — і не забыцца!

1890

* * *

Наталіць можна песняй душу,
Колькі сонца ў сабе я нашу!
Калі льецца натхнёны мой спеў, —
Сілы чую і волі прашу.

Залівайся-спявай, голас мой,
Гордых дум хай закружыцца рой.
Хай цякуць ручаі маіх слёз,
Грудзі ўсе запаўняюць сабой.

Хто шукае за светам шчадрот,
Не ўзнясецца душой да высот.
Толькі цвёрды душой чалавек
Гукаў гэтых пачуе палёт.

Калі ж сэнсу яму не чутно,
Хай самоціцца сэрца адно,
Хай праверыць сугуччы слоў,
Вып'е тое, чым поўна яно.

Скруха горкая ў сэрцы маім
Падымаецца лютасцю зім,
Я памру і пакіну радкі
Больш цікаўным нашчадкам сваім.

Ад няшчасцяў не уздыхай.
Хай пачуе мяне мой край.
Хто чуць здатны слова маё,
Той і возьме яго няхай.

Што карысці ад слоў маіх?
Толькі ўздыхі сэрцам глухіх.
Хай жа знойдзецца хоць адзін,
Хто б глыбінны іх сэнс спасціг.

Многа вас, ды не кожны зямляк
Возьме сэрцам мой верш на смак.
Тут патрэбны і розум, і зрок —
Ды няма ў яго іх, аднак.

Вы не хочаце сэрца адкрыць,
Вухам спеў вы прывыклі лавіць.
Толькі розум і сёння ваш спіць…
Як жа з вамі тады гаварыць?!

1890

* * *

Аб каханні, душа, марыш зноў,
Не суняць жаданні твае —
Так патрэбна сэрцу любоў,
Патрэбна атрута яе.

Сум увесь і гаркота нягод
Не сунімуць душы парыў,
Бо каханне — салодкі плод,
Што навек для сябе адкрыў.

А таго, хто кахаць не змог,
Чалавекам ці можна назваць?
Хай ты голы і босы — Бог
Здолеў дар табе большы даць.

Перажыць давялося б крах
Дум усіх — загула б зіма.
Слава — тлен, і багацце — прах,
Як кахання агню няма.

1890

ВЯСНА

Як таполі шумяць светлай весняй парой!
Вецер вее з далін прахалодай жывой.
Сонцам стэпавым грэты абсягі зямлі.
Як пярэсты дыван, зацвіце травастой.

Зноў смяюцца, спяваюць паўсюд юнакі,
Дый старэчым у юртах сядзець не з рукі:
Са смяротнага ложа змаглі б іх падняць
Песні, сонца, і вецер, і птушак званкі.

На качэўі вясновым сышлася радня,
Радасць гучна бруіць, шум наўкруг, таўкатня,
А знаёмыя звычна, у жартах сваіх,
Скрозь гаворкі вядуць аж да захаду дня.

Промні сонца блішчаць у вярблюджых вачах,
Коней ржанне вакол, грай птушыны ў кустах,
Над травой і ў галінках трымцяць матылькі, —
Крыльцы граюць страката на цёплых вятрах.

Безліч птушак над плёсам азёрным снуе —
Лебедзь з лопаннем крылы ускінуў свае.
Скачаш — бачыш, як пушчаны сокал ручны
З вышы небнае лебедзя з лёту саб’е.

А вяртаешся — толькі пытанні адны —
«Што здабыў?» — і дзявочыя ўздыхі чутны.
Апранулі дзяўчаты свой лепшы убор,
У далінах цюльпаны, як водбліскі зор,
У прырэччы адкрытым грымяць салаўі,
Ім зязюлі куванне даносіцца з гор.

На вярблюдах тавары прывозяць купцы,
У атарах — прыплод; мкнуць наўскач жарабцы.
Цяжкай працы сялянскай паўсюд віраток,
Часта зводзяць па юртах з канцамі канцы.

Дабрадатнаю радасцю поўніцца свет,
Упрыгожаны слаўна — Тварца запавет!
Ускарміла, як маці, грудзямі зямля
Маладога жыцця агнявы раснацвет.

Як не верыць Тварцу? — не пачуеш нязгод! —
Калі ў свеце вясновым без ліку шчадрот,
Калі цешыць скаціна і ежы спаўна,
Калі радасці скрозь найсардэчны узлёт?

Ператворыць цябе ў малайца дух вясны.
Сталі шчодрымі ўсе. Хлус і сквапнік, яны
Разам дзівяцца дужасці весняй зямной,
Разам сняць аб багацці таемныя сны.

І старыя, што белага снегу сівей,
Сцішна грэюцца, бачачы гульні дзяцей.
У блакіце нябёс — пеўчых птушак галас,
На азёрах — спаўна іх гарачых страсцей.

Ноччу — яркія зоркі і месяца рог.
Як жа ім не гарэць, калі морак залёг?
Ды пагаснуць яны, як успыхне зара,
Пазалоціць наўкол і лісцё, і мурог.

Зоркі гоніць з нябёсаў нявестка-зямля,
Бо жаніх яе — сонца — шыбуе здаля:
Ноч чакаў ён — спаткання надарыцца міг.
І цяплынню ягонай сагрэта ралля.

Толькі вецер з абсяжных прастораў зямных
Даляціць праз аблокі да зор залатых
І паведае — стрэўся з нявестай жаніх,
Цэлы свет упіваецца радасцю іх.

Бо зіму ўсю зямля — быць далей ад граху —
Толькі марай жыла аб сваім жаніху,
І цяпер, маладая і светлая ўся,
Заспявала, смяецца — спачыне крыху.

Глянуць прама на сонца — здабыць слепаты.
Я, хто ў сэрцы нясе ўзлёт яго зіхаты,
Толькі вечарам бачыў: сыходзіць яно
У спавіты заходам шацёр залаты.

1890

* * *

Было — і ў табе палымнеў агонь
Адважных і смелых юнацкіх год.
Жаданняў тваіх шпарканогі конь
Скакаў і ніякіх не чуў перашкод.

Без ліку надзей і кароткі сум,
Цябе не давіў пакутаў гнёт,
Ты верыў тады ў жыцця красу,
У светлае мары крылаты ўзлёт.

Не сілаю грубай і не мальбой,
А розумам толькі шукаў дарог.
Не цешыў сябе нікчэмнай хвальбой,
І людзям заўсёды ўсміхацца мог.

Ты стрымліваць сілу сваю прывык,
Адважна умеў адбіць удар.
І плётак ліслівых не множыў лік,
А ў бітве — ушчэнт разбіваў пачвар.

Ды юныя дні праляцяць, як дым,
Пагасне агонь маладзецкіх год.
І сёння ўваходзь жа сівым старым —
З душой маладою — у свет турбот.

Не кожнаму вер. Адступай ад зла —
Наблізіць жадае твой вораг скон:
Усмешка на твары ў яго цвіла,
А ў сэрцы заўсёды сядзеў скарпіён.

Хай рукі сяброў паціскае рука
І помста ў душы гнязда не ўе,
Пакора — паспешлівасці дачка,
Трывання гадзіны — сябры твае.

Ты сэрца шырока тым адчыні,
Хто з гонарам несці здатны імя.
Гані ад сябе майстроў хлусні,
Ліслівых шмат слоў — спакусяць трыма.

Няверны, хлуслівы і злосны свет
Эдэмам заве малады джыгіт, —
Ён хоча пяшчоты спазнаць сакрэт,
Не бачачы розных брыдот-агід.

На свяце жыцця балюе ўсмак
Улада, не маючы іншых турбот.
Джыгіт жа сціскае страсна кулак,
Жадае, каб славіў яго народ.

Напоўнены вочы яго дабрынёй,
Для хціўцаў — у ліку лёгкіх здабыч.
І зноўку натоўп адзавецца хлуснёй —
Адказ на яго самы шчыры кліч.

Старога кранеш, безаглядны хлус, —
Стрымаю дакор. Ды юнца не крані:
Спазнаўшы ўвесь солад ліслівых спакус,
Душою згарыць, як ліст у агні.

Ідзе да цябе моладзь гурмой.
Ці тварам на хлуса падобны ты?
Пачуўшы дакор вершаваны мой,
Што скажаш ёй, бо, як збан, — пусты?

1891

* * *

Лёд і жар дакрануцца шчок.
Б’юцца сэрцы у лад дваіх.
І насустрач спяшаюць зноў,
Абмінаюць людзей чужых.

І суладна пачулі страсць,
І не збочыць з дарогі ім,
І ў цяністы вялікі сад
Павяртацца здалёк дваім.

Асцярожна яны ідуць,
Заміраюць ад той хады.
І па лёгкаму кроку знак
Ім каханне падасць заўжды.

Халадзее, дрыжыць далонь,
І дыханне плыве ледзь-ледзь.
І які неадчэпны страх
Прымушае чало бялець?

Ледзь кранецца плячо пляча —
Нечаканы ківок галоў,
Губы прагнуць гарачых губ,
П’юць пяшчоту забытых слоў.

Побач — дрэва губляе шум,
Неба — зорак іскрысты рой.
І, як зоркі, дрыжаць яны
Патаемнай начной парой.

Поўні поўныя згусткі крон,
Ціша гнёзды ў сутонні ўе.
Ў сэрца, поўнае чысціні,
Насалода праменне лье.

Сэрца скорана растае,
Б’ецца з гучнасцю у разы.
І наміткаю на вачах
Ледзь прыкметны узор слязы.

Дзе вы, думкі і словы, дзе?
Забыцця ўжо так блізка час.
Пераможнай красой любоў
Ці прывеціць сягоння вас?

1891

* * *

Ты — вачэй маіх зрок,
Што працяў золь і змрок.
Сэрцу мук не пазбыць,
Не адпрэчыць на крок.

І мудрэц, сам не свой,
Ўсмак кіўне галавой,
Скажа: «Не, між жывых
Не страчаў я такой!»

Я блукаю ў журбе,
Сам не рады сабе,
Россып слоў залатых
Прыбярог для цябе.

Ад душы ў цішыні
Гавару — не спыні.
Бо самой жа няўцям,
Дзе цудоўныя дні.

Зразумееш наўрад
Пачуцця дзіўны лад.
Выгляд скромны ў цябе,
Ды гарачы пагляд.

Холад твой ахіне
І другіх, і мяне.
Боль хаваю, слязу
Па тваёй лью віне.

Косы цемрай начной
Над зарой, над ракой.
У вачах — глыбіня.
Твар — для ўцехі людской.

Зыркі рот — хмельны мёд.
Зубы ззяюць — як лёд.
Пазабыў я спакой, —
Колькі іх, насалод!

Гнуткі стан — трапяткі,
Вабны колер шчакі.
Цнота белых плячэй,
Воч святло — плынь ракі.

Не пачую я ног,
Як ступлю на парог.
Страсці раб, я аслаб,
Ад кахання знямог.

Ты ў самоце — паўзмрок.
Яснасць — сонечны зрок.
Смех твой — трэль салаўя —
Сэрцу чутны здалёк.

Ты — пяшчота сама.
Спадзяюся — дарма?
У журбе без цябе
Мне жыцця ўжо няма.

Грае фарбаю зор
Твой чароўны убор.
На цябе пазірну —
Голас сэрца замёр.

Не стаміся ў хадзе
Ад хвалы, што гудзе.
Слоў патрэбных знайсці
Не змагу я нідзе.

Знаюць бедны і цар:
Прыгажосць — Божы дар.
Наказаў нам прарок
Мець сіло гэтых чар.

Зыркіх слоў дываны…
Ці патрэбны яны?
Сэрцу ты, толькі ты
Мары шлеш, дорыш сны.

Мне ў самоце спяваць,
Мне — цябе забываць.
Сэрца стогн так гучыць,
Што і слоў не чуваць.

Колькі нас ноч не спіць.
Ды з табой нам ці быць?
Блісне дзіўны твой смех —
Страсць мацней закіпіць.

Многа страсці ахвяр
Міг чакае, як дар.
Ці наступіць той дзень,
Што спатоліць мой жар?

1891

* * *

Да цемрашалаў быў пагардлівым здаўна,
Лічыў заўжды іх род адной пагарды варты.
Мне свет перарабіць жадалася спаўна,
Ды ўсё ж перацаніў я сілы ў час пагарды.

Я адбіваўся сам, падтрымкі не займеў,
Калі бязглузды хлус са мной спрачаўся хціва.
Разумнік не адзін стаяў, схаваўшы гнеў,
І вочы апускаў, сыходзячы маўкліва.

І страшна мне на іх свой супыніць пагляд:
Як утрапёныя, яны праходзяць міма.
То упіраюцца, то пяляцца назад,
Ды азіраюцца няўцямнымі вачыма.

Згаджаюцца падчас, хаваюцца у цень,
Зноў з'едліва шыпяць пыхліваю гурбою.
Няма ў мяне больш сіл, за днём сыходзіць дзень,
І хочацца душы астатняга спакою.

Як мул, стаміўся я. Я госць дзяцей сваіх
І жонкі ўласнай. Мне чужымі сталі сцены.
Вядомы добра мне суровы нораў іх,
Ды і ў народзе я не прадчуваю змены.

Зусім я не бядняк, але ў тузе жыву
І горычна аб тым, бывае, разважаю.
Калі даводзіцца, сваімі вас заву,
Хоць сам перад людзьмі ад сораму згараю.

Разлад з-за цёплых месц, насілле, і паклёп,
І хваравіты зуд да кожнай новай справы…
Бадзягі, невукі, адроддзе недацёп,
Усё вы аддалі ў жыцці для таннай славы!

Здаўна сяброўства дар і свет душы жывой
Вам у цяжар былі, і вартыя дакору,
Бо толькі хцівы зман для вас жаданы, свой,
У ім адзіным вы знайшлі душы апору.

Падалей будзь ад іх, сумленны чалавек,
Стаміўся я, і ты агорнешся самотай.
Я розум іх будзіў, ды мной пражыты век,
Яны не ўчулі спеў, спавітыя дрымотай.

1891

* * *

Адкажы мне, душа, што шукаеш?
Бестурботным жыццё тваё стала.
Ўсё імкнешся за свет, ўсё блукаеш,
Побач сядзь, памяркуем удала.

Той, аб кім сказ вядуць без супыну, —
Глянеш — чынна купаецца ў славе.
Ды хвала, што гучыць без прычыны,
Не пасобніца слову і справе.

Не згадае праныр добрым словам
Той, хто гонар нясе чалавечы.
Справядлівых пачуй і талковых —
І не стане вар'ят небяспечным.

У ліслівасці хітрыя ўхвалы,
Для душы з іх карысці нямнога.
Дабіваецца славы няўдалы,
Каб не чуць у свой адрас дурнога.

Скрозь гандлююць і словам і справай,
Не спяшайся на торг хітры гэты.
Слава таннаю стала забавай,
З ёй сябруюць адны прайдзісветы.

Як прадажныя словы — ці варта
Іх купляць, хоць яны ў пазалоце?
Ды бывае: жанчына не жартам
Лічыць мужам таго, хто ёй плоціць.

За жыццё чуў ліслівасці столькі,
Каб жадаў — не панесці ў магілу.
Ад нікчэм на зямлі мала толку,
Прыйдзе смерць — стануць жменькаю пылу.

Словы-зыкі пустой пашаноты,
Як вадзіца ў пясок, уцякаюць.
І дабро, і людскія дурноты,
Як падумаць, — атрутай бываюць.

1892

* * *

Сэрца, не біся важка ў грудзях!
Стала ты смешным для ўсіх, зразумей.
Ці можна спагаду шукаць у людзях?
На тых пазірні, каго знала раней.

Бляе ягнё — прадчуванне бяды,
З'явіцца маці — шчыпае парэй.
Сэрца, імкнешся зноў жа куды,
Б'ешся часцей і мацней?

Вернасці марна прагнула ты,
Колькі гаручых слёз праліло.
Зноўку чаму пасярод слепаты
Студзіш у лёце крыло?

Мной кіравала разоў — уга!
Колькі тваіх перажыў я здрад!
Хутка надыдзе мая чарга.
Буду патрэбны табе? Наўрад!

1892

* * *

Мне боль вучэнне нясе,
Сум прасвятленне нясе,
Самотай поўняцца скрозь
Ад горкіх слёз словы ўсе.
За днямі рушылі дні, —
Скуль радасць здзейсніць палёт?
Не здатны конь абскакаць
Па ўскраі поле нягод.

Іх, занядбалых старых,
Скажыце, дзе не было?
Калі твой ясны пагляд —
Жыцця ці ўбачыш святло?

Як розум скуты твой спіць,
За грошы шчасце купіць
Ці здатны сын твой — хітрун?
Душа — гадзюкай шыпіць!
Варожыя ўсе дары —
Дарэмная сумятня.
Той, хто ў багацці жыве,
Сядлае шчасця каня,
А бедным — гонар адзін:
Чакае голад штодня.

Ты бавіш час у гасцях,
Дзе грэе дружбы ачаг, —
Вясёлым, добрым сябрам
Адкрыты сэрцам казах!
Спявак галасіць пачне —
Натоўп яго ахіне,

Хоць дакарае не ўслых,
Ды рот яму не заткне…
Калі ўжо сумніў чуцён
І слова гучыць, як гром, —
Насмешак збаіцца ён,
Пакіне сяброўскі дом.

Чым хворы тут кожны з нас,
Адкрые мой ціхі сказ:
Задзёрлі адны насы,
Іх розум жывы пагас;
Другія ўсё пра закон
Балбочуць — настаў іх час,
А трэцім — усё у смак,
Збыліся душы якраз;
Чацвёртых у Мекку шлях
Гукае тварыць намаз.
Калі ж ім выконваць тут
Гаротных людзей наказ?

Няшчасны стары бядак
Бяжыць ад людзей, аднак
Бывае ў яго сям'і
Разладу нядобры знак.
Свяжуюць тады барана,
Садзяцца, ядуць усмак,
Парады усе даюць,
Ды ён у журбоце змяк…
Аб'едкі чужыя еш —
Ці смерць сустракай, бядак!

Калі напраўду сказаць,
Дзе гэткіх няма старых,
Хто ў старасці беднай сціх?
Лёс горкі заўсёды ў іх…

1892

АСПАНУ

Пакуль свой разгорнуты сцяг
У дужых трымаеш руках,
Пакуль не штурхала ўсяляк
Знявага сярод забіяк,
Пакуль ты красуеш, як мак,
Пакуль тваё сэрца — маяк —
Палае пяшчотай няўзнак,
Пакуль ты ўсім верыш, дзівак,
Пакуль на папасах тваіх
Вясной прарастае злак,
Пакуль твой агонь не суціх,
Пакуль ён шугае, зырчак,
Пакуль не сеў морак, як грак,
Пакуль твой крок цвёрды не змяк,
Ты помні пра смерць, аднак!

1892

* * *

Малады і стары —
Страсці зведаў запал.
Дзён юнацкіх віры —
Адбуяніў іх шквал!

Бляск яснот юных год,
Пошуг ранішніх мар.
Параўнаць з чым іх плод,
Хараство юных чар?!

Скажаш з гонарам так:
«Помню я шчасця дні!»
Скажаш з сорамам так:
«Дзе яны? — дагані!»

Тыя дні для цябе —
Хліпкі бляск, смутны сон.
Бо з глухой нематы
Не павернеш тых дзён.

Слоў жывых больш не мець,
І душой — толькі цьмець,
І чужых слоў жывых
Не змагчы зразумець.

1893

* * *

На дабро пазабыць тут рады,
Зло надоўга заводзіць звады,
Конь надзеі — аслаблі лейцы —
Не паскача за далягляды.

Як ні сек бы яго ты плёткай,
Конь саступіць дарогу бедам.
Пра адну не паспеў падумаць —
Сотні іншых нясуцца следам.
Рушыць гора-джыгіт за намі,
Не расстацца нам з хмурым дзедам!

Пакуль не развеюцца хмары,
Не пабачыш ясноты сіні.
Пакуль сэрца прымае ўдары,
Душа навальніц не супыніць.

Пакуль не развеецца гора,
Губ тваіх не кранецца ўсмешка…
Трывай жа, нягоды агорай,
Не схіляйся — па-рабску спешна.

Хто бязвольны, слабы душою,
Сам заслужыць сабе пакаранне.
Наляцяць бяда за бядою
І асудзяць яго на выгнанне.

Дык сустрэнь жа бядоты смела,
Адбівай жа іх мужнай рукою!
Ды абдураць хітругі ўмела,
Не дадуць мне усё ж спакою.

1893

* * *

Вось і восень мая надышла —
У агуслай смузе далягляд.
Сэрца майскага прагне цяпла.
Ды ці вернеш май светлы? Наўрад!

Душы многіх укрыў вечны снег, —
Ці ж пралеска ў снягах расцвіце?
Толькі з сэрцам-агнём чалавек
Не заблудзіць на сцюжнай вярсце.

Аніколі не ўзняцца ў палёт,
Тым высокіх нябёс не скарыць,
Хто не ведае іншых клапот,
Як падбаць пра выгоду-карысць.

Рухі поўныя ў іх мітусні,
Стала чорнай і сквапнай душа:
Баляваць у другіх дзень пры дні
І не траціць пры тым ні граша.

Дык чаму ж бестурботна не жыць
Тым, хто вечна ў мане шчыраваў
І чакаў — паваліць, задушыць,
Хто і хітрасць сваю прадаваў?

«Баязліўцы» — цаны не дасі
Іншай тым, хто жадае так жыць:
«Як сумленне сваё прадасі,
Дык і шчасце сумееш набыць».

1894

МОВА КАХАННЯ

У вялікім сугуччы моў
Ёсць адна, што зусім без слоў.
Толькі сэрца гукне пагляд,
І пачуцці запаляць кроў.

Мовай гэтай валодаў ты
Ў час юнацкі свой залаты,
Ды цяпер яе разумець
Ты адвык ужо — гук пусты.

1894

* * *

Будзь разборлівы між людзей.
І найперш талент свой узваж.
І зіхотным вянцом надзей
У зруб новы трывуча ляж.

Двое шляхам зямным ідуць:
Крочыць першы, другі — услед.
Воля з розумам іх вядуць,
Справядлівасць гукае ў свет!

Калі воля ёсць — розум ёсць.
Дзе дабра няма — там мана.
Сэрцам створана прыгажосць,
Ды не кожнаму ўсё ж відна.

Утрымай яе светлы блік
І хвалы не шукай — глядзі:
Ў прыгажосці прачысты лік,
Сэрцам чыстым яго знайдзі.

Волю даўшы пустой хвале,
Што лісліва паўсюд гудзе,
Зайздрасць выкліча ўсё ж, але
Сам аступішся ты ў хадзе.

Цвёрдым крокам ступай смялей,
Працы радуйся мазалю.
Словы тых, хто вучыў дзяцей,
Як зярняты, ляглі ў зямлю.

1894

* * *

Я многа мудрых слоў сказаў у лёце дзён,
З тугою бачыў іх заўжды няважкі плён.
І думаў я, што хтось ад сораму згарыць
І стане чэсна жыць, забыўшы чэзлы сон.

Аднак з людзей усіх вы — балбатлівы люд,
Адзін другога ўсё ж не разумеюць тут,
Без сэрца жаркага і без гарачых слёз
Вам нельга растапіць халодны лёд пакут.

Сэнс слоў маіх пачуй, народ упарты мой,
Я разгарну спаўна натхнёных дум сувой,
Магчыма, для сябе ў іх знойдзеш ты карысць,
Не для забавы тут я гавару пустой.

Не заблудзіся ўсё ж, народ, сярод слаты,
Пара тваёй душы пазбыцца нематы.
Калі не веды ўжо і не працоўны гарт,
Дык навучыся хоць скаціну пасвіць ты!

1895

* * *

Аб харчы смакотным век марыць галодны трыбух,
А тлустае пуза — заўсёды ўмінае за двух…
Вядома, што тлустасць сама, як палова багацця,
Ля ежы казах не паскорыць ніколі свой рух.

Галодны казах, каб ад смерці сябе ўратаваць,
Гуляе без справы і марыць, як харч здабываць.
Не ведае харчу каштоўней кумысу і мяса, —
Ды беднасць адна здатна лёсам тваім кіраваць.

Калі б ужо меліся мяса для ўсіх і кумыс —
Другіх спадзяванняў у сэрцы б з’явіўся абрыс.
Не кожны ўжо дзень і наесціся ўсмак удаецца,
А рабская праца ні манну не сее, ні рыс.

У доме уласным, скажы, чым накорміш дзяцей?
Жабрацкая доля вядзе ўсё часцей і часцей.
Кумыс ды касцё — вось за працу нялёгкую плата,
Яе адшкадуе заўжды для цябе багацей.

Ты ў горы сыдзі і вярніся са статкам назад,
Ў ауле багата хто будзе нагодзе той рад!
Жыццё — сухавей, калі ўсё яно толькі бадзянне.
Хай дужасць адкрые шырокі душы далягляд.

Без смеласці, волі шчаслівым ніколі не быць,
Не стаць чалавекам таму, хто не здатны любіць
Ўсялякую працу — хвала, хоць і чысціш асла!
Ты рукі і гонар не зможаш у бруд абрабіць.

Калі ж ты багацце ўсё хітрай хлуснёю здабыў,
Прывык да гультайства, крадзеж ды падман палюбіў, —
Паплацішся горка за чэзлыя гэтыя звычкі,
Спакою не знойдзеш — шчаслівым хвіліну ці быў?

Дарамі чужымі жывуць пустадомкі адны.
Што лёгка здабыта — не мае ніякай цаны.
Здабытыя лёгка табою багацце і шчасце
Растануць уміг, як снягі на сугрэве вясны.

Адзенне ўпрыгожыў, каня — і ў дарогу! Бывай!
Вядзе паляванне за ежаю жвавы гультай.
За ім не ганіся — няўцям шалапуту, як бачна:
Паўсюд за аб'едкі сумленне і гонар аддай!

На нашых прасторах нямала падобных гуляк —
Вясёлых пранырaў, што шнараць, як зграі сабак,
Пагарды адзінай бадзягі такія і варты,
Да іх не памкніся душою, бяздумны бягляк!

1895

* * *

Ці бачыў? — дзяцінства сышло.
Радасці згасла святло.
Юнацтва было — сплыло.
Старасць схіліла чало.
Магчыма, не раз у жыцці
Непастаянства жыло?
Здрады шугала крыло…
Магчыма, няшчасны, памрэш,
Як тое ягня ў хляве,
Дзе месца яго і было?

1895

* * *

Калі ў ручай ступіў баран — вадзе тлусцей не стаць,
І смешна нам, як стане воўк наспех яе хлябтаць.
Як гэты воўк, гляджу наўкруг — нічога не відно.
Няўжо прасторны гэты свет мне думкай не абняць?

Няўжо прыходзіны твае на свет былі як знак
І ўвесь сусвет жадаеш ты заціснуць у кулак?
Крыляе думка зноў твая ў нябеснай вышыні,
Ды ўсё ж апоры на зямлі не знойдзе аніяк.

Спазнаць ахвочы чалавек свет розумам жывым,
Саступіць наша думка ўсё ж перад Тварцом адным.
Я засынаю — стомы гнёт, ды вочы зноў адкрыў —
Імкнуся тайну разгадаць аб розуме сваім.

Ды я сумненняў адмаўляць не стану наўздагад:
Няма сумненняў у душы і дум не ўспыхне лад.
Калі ж падчас бяссілле дум — мне не засумаваць,
Бо думаць лепей, як заўжды чакаць чужых парад.

Народжаны мы думаць, жыць, і кроў нам даў Алах.
Дык як жа думкаю сваёй нам не адужаць страх?
Няхай без думак пражывеш — ды прыйдзеш да высноў.
Жаданні лепшыя займець зямны ці зможа прах?

Твая жыццёвая сцяга, нібы напяты лук.
Пакуль жывеш, яго Алах не выпускае з рук.
Да праўды, ведай, не вядзе ён, пакручасты шлях,
На ўзлёце цэлячы жыцця, ты меткім будзь, сябрук!

1895

* * *

Прах мой сатлее, ды сам я не знікну, о не,
Хоць і вачэй маіх сонца ўзыход не кране,
Хай развітанню з цялеснаю існасцю быць,
Толькі душа мая ў зорныя высі памкне.

Вабіць нас гэтага свету падманлівы кліч,
Там, дзе ліецца святло, ён міргае, як сыч.
Мёртвым не станеш ніколі, зямны чалавек,
Толькі бяссмерце ў слове сваё узвяліч!

Хай прыгнятае жыццё, ды разважлівым будзь,
Шлях твой кароткі, — пра вечнасць сваю не забудзь;
Прагнеш спасцігнуць ты веку пакуты і зло —
Ў розуму нетры спакойна спяшай зазірнуць.

Сябар жыццю, ты для свету другога чужы,
Сферы сусвету зноў дзеліць нябачнасць мяжы.
Прагі жыццёвае поўны, адпрэчыш нябыт —
Верыш душой у святло і аб гэтым скажы.

1895

СПАЧУВАННЕ НЯВЕСТЦЫ МАЁЙ, ЖОНЦЫ АБДРАХМАНА

Магіш, дарагая, не плач,
У горы ўстань, як скала,
Іначай сэрца тваё
Атруціць болю страла.
Звяў твой ружовы цвет,
Самота ў душы залягла.
Рана ці позна — усім
Пазбыцца ў муках святла.
Ў разлуцы з другам душы
Адна хіба ты была?
Родная, нас пашкадуй:
І наша доля — сышла.
Яднае нас гора ўсіх:
Народжаных — смерць адняла.
Вялікі ты, ці малы, —
Погарбы смерць намяла!
Прыйдзе апошні наш час —
Тлену аглушыць імгла.
Хто здолее смерць змагчы?
Яна ўладарна ўзышла!
Увесь падуладны ёй
Свет, што згарыць датла.
І ведаю я, Магіш,
Ён светлы быў, ты — жыла.
Ды марныя слёзы твае, —
Падняць яго ці змагла?
Замёр твой сардэчны спеў,
Душы не падняць крыла.

Дзе ж дзень, што шчасна гарэў?
Радасць яго адгула.
Кветкам на свеце якім
Вернаю будзе пчала?
Ён пераменлівы, свет,
Сонцу яго хвала!
Згіне, скароны тугой,
Скруха мацней сіла.
І ты, Магіш, слязой
Смутак не змыеш свой,
Твой сокал да сонца ўзляцеў,
Зямля яго узняла!
Са ўсіх дзяцей маіх, смерць,
Ты лепшага адняла.
Як цяжка, як цяжка мне
Сярод любімых маіх!
Не плач, Магіш, пашкадуй
Бацьку і маці — усіх.
Лёсу нам не змагчы,
Дужай будзь сілай жывых.
Душа шчыміць, як струна.
Страта — вастрэй штыка.
Пачуем адзін аднаго.
Я стаў бядней жабрака.
Самота — ценем крука,
Апоры шукае рука.
Ды дзе яна, дзе яна?!
Гаркоты ў сэрцы рака.
Уцехі яму не знаць.
Мне наша скруха — цяжар.
Мой сын — надзея, вясна! —
Не ўстане. Ў скрусе гібей.
Самотна гасне мой час.
Магіш, мяне зразумей!

1895

АПЛАКВАННЕ АБДРАХМАНА ЯГО ЖОНКАЙ МАГІШ

Тварэц наш! Колькі горкіх слёз
Ты мне паслаў сярод нягод!
Мне выпаў самы скрушны лёс
Аплакаць маці ў юні год.

Агонь душу спаліў датла,
Мой лёс балесны і глухі.
Я шчасцем кожны дзень жыла,
А ты адсек яго шляхі.

Мяне трыванню ты вучыў
І час вітаў мой малады.
Цяпер мяне ты разлучыў
З маім Абішам назаўжды.

Агонь красы маёй заснуў,
Сухой сцяблінай стала я.
Мяне самотай агарнуў,
Ужо ўдавою стала я.

Мне толькі дваццаць дзве вясны,
А чую скрухі галасы.
Не, сэрцу болей не відны
Ужо бясхмарныя часы.

Мне смерці слаць штораз праклён,
Трываць пакуты між начы,
Мне не вярнуць мінулых дзён,
Самоце не дапамагчы.

Душы глыбокай не займець,
Высокай мары не займець,
Кахання болей не займець,
А толькі — адзіноту мець.

Агмень душы маёй пагас,
Сляза пакуты наплыла:
Быў не са мною ў смертны час,
Ў апошні шлях не правяла.

Мне грудзі скуты боль пячэ,
Я слёзы лью, начэй не сплю.
Самотная, жыву яшчэ —
Ў слязах тугу сваю таплю.

Тварэц! Завошта мне паслаў
Самоту-скруху на парог?
Навошта ты тугой заслаў
Глухую даль зямных дарог?

У чорным покрыве прайшла
З паніклай, цяжкай галавой.
Ля апусцелага жытла
След мужа ўжо зарос травой.

Мне вешчых дум не перадаць,
Якімі жыў натхнёна ён.
Высокі розум прыгадаць,
Ўсё, да чаго імкнуўся ён.

Быў справядлівым, сціплым муж,
Глядзеў з пачцівасцю наўкруг.
Сярод усіх жыццёвых сцюж
Быў мне надзейны, верны друг.

Пагасла шчасце, адцвіло,
Пакінула пякучы боль.

У сэрцы тло гняздо звіло,
Не ўстане наша сонца больш.

Праз плач і слёзы ўсё скажу.
Няхай пачуе свет увесь,
Што я між суцемкаў блуджу,
Што сонца згасла ў небе дзесь.

Цячэ ручай гаручых слёз.
Як плынь яго душы спыніць?
Чакала шчасця… Выпаў лёс
На сцюжах свету ў скрусе жыць.

Пад сонцам толькі раз жывём.
Чаму ж так цёмна, бы ўначы?
І жыць адным прагорклым днём
Мне, да магілы ідучы.

Але я марна смерць заву,
Яна не чуе, не ідзе.
Не хоча ведаць — удаву
Ёй нельга кінуць у бядзе.

Мой дух, як квеценню вясны,
Табою дыхаў — свет любіў.
Ты толькі подыхам адным
Надзеі светач патушыў.

Як паратунак, смерць чакаць,
Яна адна развее змрок.
Збавення мне не адшукаць —
Адно бяды і чую крок.

Гара — і прорвіна пад ёй,
Лячу ў яе штоноч, штодзень.
Пагасла ўсё ў душы маёй,
Жывы не выблісне прамень.

Пад чорным сонцам я жыла
З няпамятных маленства год.
Святлом з каханым ноч была,
А зараз — цемені ўзыход.

Душой бяскрылай не ўзляціш.
Ці ж ранак выблісне ў акне?
Як сон з’явіўся мне Абіш,
Як сон пакінуў ён мяне.

Зноў ростань памяць варухне,
Зыход як вечны перажыць?
Пустэчу чым запоўніць мне?
Чым раны сэрца залячыць?

Ад хаты роднай падалёк
Ён, быццам сонца, грэў мяне.
Мой са скалы сарваўся крок —
Ляжу у прорвіны на дне.

Усё, што радасцю было,
Зямной уцехай мне было,
Зялёным садам мне было, —
Гаркоту сеючы, сышло.

Жылі асобна два гады,
Быў шлях да шчасця не прамы.
Ды крочыў блізка цень бяды —
Навекі ўжо ў расстанні мы.

За што, за што, Тварэц, скажы
Ты ў пекла свет ператварыў?
Чаму паўсюд растуць крыжы?
Ты ж смертным мары даў парыў!

На свет бязрадасна гляджу,
Штохвілі помню пра бяду.
Лістком бярозавым дрыжу,
Вось-вось з галінкі упаду.

Бывай навекі, радасць дня,
Уцехі сэрцу больш не мець.
Мяне не вабіць вышыня —
Там птушкай чорнай кружыць смерць.

Ў агонь я кінуся — згару,
У рэчку — захлісне вада.
Нязначнае, што гавару,
Ды цэлы свет мая бяда.

1895

* * *

Скаціна цешыць хціўца з году ў год.
Без сораму падмане ён народ.
Ганебны раб нажывы, сам трапеча,
Калі падаць бяздомнаму чарод.

Навошта статкі множыць дзень пры дні?
Каб зайздрасць чуць у хцівай сумятні.
І ён, свіння, таго сабакам лічыць,
Хто костцы рады і яго хлусні.

Сумленне, розум сёння ўжо не клад.
Багаты той, хто мае іх? Наўрад!
Бляск золата шукай у кучы гною,
Багатым станеш ты — сапраўдны хват!

Чытай мой верш, падумай у цішы.
Нам мазалі мілей, чым барышы.
Карысць пустошыць… Ці пражыць нам годна
Без розуму святла, агню душы?

1896

* * *

Сярод старых я пачуваюся чужым,
І з дзецьмі згоды не знаходжу — збрыдзеў ім,
Равеснікаў, каб і былі раднёю, —
Пакінуў бы, учуўшы сіл уздым.

Багацця розуму не знойдзеце ўжо вы,
У лахманах блукаю з ног да галавы,
Нясмачным стала ўсё — і сон, і ежа,
І галавою я, і барадой сівы.

Цяпер нястрашны ўжо любы пляткар,
Бо ты, згубіўшы смак юнацкіх мар,
Стары буркун, вартуеш двор счужэлы,
Пазбыты розуму дзівосных, вабных чар.

1896

* * *

Дзяўчына-красуня у хана жыла.
Усё ён аддаў той, што любай была.
Хадзіла у золаце, пышных шаўках,
Ёй плойма служанак косы віла.

«Як бык пладавіты, дык шумны як вол», —
Пра хана старога гавораць вакол.
Дзяўчына ад шлюбных старэчых уцех
Знайшла вечны схоў сабе — сыры дол.

Што юнаму сэрцу баль пышны той!
Павінен жаніх ззяць красой маладой.
А драхлыя косці, што прагнуць вярнуць
Сваю маладосць, ці патрэбныя ёй?

Ці ж бавіць жыццё з нямоглым старым?
Не скорыцца сэрца — ліслівасць, як дым.
Нявесты старэй ты на дваццаць пяць год —
Не станеш ёй мужам, не купіш нічым.

У схованках мораць жонак дзяды,
Адняўшы красу іх вясны назаўжды.
Як сэрцу старэчаму ў высі ўзляцець?!
Яна ж не цяліца, каб гнаць хоць куды!

У бая сівога ўся моц у грашах,
Ды юным не стане ён — злосць у вачах.
Нікчэмны, чыюсьці дачку за калым
Прыдбаў ён — і, дурань, ад шчасця ачах.

А чым жыве жонка — ці ведаць яму?
Прыветна ўсміхнуцца адно аднаму.
Аблытала добра, а ты ўжо і рад,
Што згодна патрапіў да шэльмы ў турму.

Ты, бай, сцеражыся! І не міргнеш,
Паверыўшы жонцы, як здраду пажнеш.
Прапашчым той стане, хто шчасце знайшоў,
Век хвалячы жонку, бо чуў — пі і еш!

З ціхмянай байбішэ ўсё сварыцца дзед,
Яму ж маладуха — смяецца услед;
Адна — як курай той, другая — як мак.
Ўдваіх снег і спёка не рушаць на свет.

Гібее ў пакоры той шлюб да пары,
Яго не змацуюць любыя дары.
Ад сэрца да сэрца адлегласць у год!
Ці здатны з'яднаць сэрцы, дурань стары?

1896

* * *

Напеў гэты светлы ўвесь свет абаўе,
Сагрэты ён думкай — крыніцай б’е.
Мелодыя — думкі святлісты цень —
Хай цешыць наш слых гучанне яе.

Крыляе высока парыў тваіх дум,
Ён сэрца лагодзіць, гонячы тлум.
Хаваюць напевы ўсю радасць зямлі, —
Не чуе глухі толькі ўладны іх шум.

Хай спячае сэрца кліча той спеў,
Узносіць у высі між сцюж і залеў.
То будзячы сум, то жаданняў рой,
Гаворыць табе, што шчасце займеў.

Але ж ці багата тых, хто б хацеў,
Пачуўшы, свой водгук паслаць на спеў,
Каму хваляванне падорыць ён,
Пяшчотны і сумны, як пошум дрэў?

Сумуе, маркоціцца, вабіць напеў, —
Душу цеплынёю, пяшчотай сагрэў,
І вось ужо з ёю зліліся ў адно
І страсць, і каханне, і радасць, і гнеў.

Ёсць песня пустая і песня — друг.
Тых першая цешыць, хто сэрцам аглух,
Другая — як мудрасць сама, гучыць
І ўзносіць у высі стамлёны дух.

Я ўклаў у шэсць строф свайго сэрца жар,
І чуйным аддаў жывых слоў нектар,

Глухіх азадачаць яны — ну й што ж!
Спяваю я тым, хто не збыўся мар.
Сэнс песень маіх будзе ясны тым,
Хто ў сэрцы агонь нясе, як Ікар.

Прыходзіць вясна — сышлі халады,
Застаўся ў мінулым цень скуты бяды,
Харошую песню душой прымі,
Яна для цябе, як глыток вады.

1896

* * *

Час пасміхнецца ці толькі міг,
Сэрца ўсхвалюецца і замрэ:
Подых натхнення з глыбінь жывых
Шэрай будзённасці сум сатрэ.

Будзе шматколернай прыгажосць,
Ўсё зажурчыць, як горны ручэй.
Вось яна, радасць зямная, вось! —
І ападзе заслона з вачэй.

Сэрца напружыцца, як цеціва,
Думкі — вясёлыя дзеці слоў —
Прыйдуць жадана і раз, і два,
Знойдуць і плоць, і гарачую кроў.

Сцісне папругай паэт свой стан,
Гляне далёка, хітне галавой,
Кожнае слова, як талісман,
Светла падорыць думцы жывой.

Будзе глядзець ён пільней за арла,
Роздуму струны ў душы кране,
Супраць нікчэмнасці, супраць зла —
Сэрцам паўстане, свет захіне.

Людзі пачуюць слова як цуд,
Несці пачнуць яго з краю ў край.
Суд справядлівасці, розуму суд,
Ты рассудзі нас, і ты пакарай!

Сэрца нястрымнасць, розуму жар,
Моўнай атруты аж два глыткі.
Праўду жыцця вам прыношу ў дар!
Не знеслаўляйце — паэт такі!

1896

* * *

Не проста гук гадзінніка — «цік-так»,
То дзён мінулых ёсць бясспрэчны знак.
Сышла мінута — стала карацейшым
Жыццё, якое не ўтрымаць ніяк!

«Цік-так»… Гадзіннік гучна, на свой лад,
Падводзіць лік і радасцей, і страт.
Мінае ўсё. Зямны час беззваротны.
Мінулае ці вернецца? — наўрад!

Хоць вер не вер, а ўсё-ткі гэта так!
Жыццё у вечнасць зносіць гук «цік-так».
Ды падмануць усе сябе гатовы,
Патайна помніць тое нат юнак.

Так дзень за днём, і так — за годам год.
І неспадзеўка — старасці прыход.
Не вечны, пэўна, век у чалавека,
Тварэц адзін — апора між нягод.

1896

* * *

Наступнасць закрыта туманам ад нас.
Праменнем надзеі зырчэе падчас.
Час гоніць упарта гадзіны свае:
Без ліку сплыло — не адзін век пагас.

Падобна мінулым, наступныя дні
Сыходзяць нячутна — бяжы, супыні!
Між іх і тваё затаёна быццё.
Дарована Богам з нябёс вышыні.

«Я» — розум прамовіць. «Маё» — скажа плоць.
Ды целу з душою не ўжыцца. Супроць
Паўстане заўжды бессмяротнае «я».
Няздатная плоць небыццё пабароць.

Навошта ж «маім» ты пажадна жывеш?
У соладзе плоцкіх жаданняў слывеш.
Дабро, справядлівасць — вось нашы сябры.
Ты з імі аднымі ў нябыт адплывеш.

Душу ты за золата здатны прадаць,
Сумленне астатняе д’яблу аддаць,
Жыццё тваю радасць украдзе, павер,
Жыцця вераломней не зможаш ты стаць.

Дарэмна сваім лічыць свет чалавек.
«Маё» — гэта кропля вады з плынных рэк.
І што яны, плоць і зямное дабро,
Як дух тваё цела пакіне навек?

Нямоглых шкадуй і гаротных сірот,
Знайдзі для іх мноства душэўных шчадрот.

Пра люд клапаціўся сам нават Тварэц,
Палюбіць цябе ён, бо любіш народ.

Ды ведай: натоўп і народ — не адно.
Ваўкі між людзей ёсць — зваўчэлі даўно.
Дык будзь справядлівым, праўдзівым век будзь,
Хай сэрца падкажа — не схлусіць яно!

Патрэбная ўдача смяротным усім,
Ды зло ад дабра аддзяліць цяжка ім.
Аднойчы ўсё ж невукаў скончыцца лік.
Ёсць вера і праўда — на тым і стаім.

1897

* * *

Крык грубы, роў асла —
Толькі прыкрасць ці трэба нам?
Плод разбойнага зла
Саладзей часам хлеба нам?

Ноч, што цемрай лягла, —
Ці ж святлей ужо неба нам?
Радасць, што адгула, —
Ці ж у ёй ёсць патрэба нам?

1897

* * *

Тэрмін дзён сваіх ведаць ці ж маглі
Травы, што вясной вылезлі з зямлі?
Ростам з дрэва стаць і памкнуць да зор
На сугрэве дзён марыць і расток;
А што град саб'е ці буян-віхор —
Хай падаў бы свет хоць адзін намёк!
Дадзены запал сэрца маладым,
Час міне — і шал недаступны ім.
Не хваліся: ты — не вышэй за ўсіх, —
Згасне твой запал, станеш сам старым.

1897

* * *

Чароўнай песняй пад струнны звон
Ахоплены ўвесь ты ў начной цішы.
Песні мяне бяруць у палон,
Любі іх, як я, — ад усёй душы!

Схавацца спехам ад звычных спраў,
Я забываю пра белы свет.
У сэрцы маім усё спеў забраў,
І ён красуе, як макаў цвет.

Знайшоўшы гэтак ваду ў пясках,
З жадобай вуснамі прыпадуць.
І колькі будзе ў людскіх ціскаx,
Ды вусны слодычы не аддадуць.

Я добра помню мінулы час,
Дзе гора, радасць і дзе любоў, —
Усё, дзе мары агонь не згас,
У плоць жывую ўбярэцца зноў.

І зноўку мой напаўняе слых
Забыты пошум мінулых дзён.
І вабіць зноўку рой дум былых,
І дорыць сэрцу ясноту ён.

І пахвалу пачынае ўжо
Прымаць за праўду душа мая.
Ці ёсць на свеце той яд няўжо,
Які б да кроплі не выпіў я?

1897

* * *

Розным людзям не вер, што высока ўзнясуць, —
Бо яны вераломна цябе й прададуць.
Вер сабе! І апора, і шчасце тваё —
Гэта праца і розум, што побач ідуць.

У давер не ўпадзі, дай ліслівасці бой,
Ганарыцца не ўздумай пустой пахвальбой!
Збіты з тропу, няўжо ты паверыш у зман,
Што паўстане, нібыта міраж, прад табой?

Калі гора надыдзе — спіны не згінай!
Калі з'явіцца радасць — дастойна прымай!
Зазірні ў сваё сэрца — ў яго глыбіні
Жэмчуг знойдзеш, яго беражы, не губляй.

1897

ГАБІДУЛЕ

Пралеска, пасміхнуўшыся вясне,
Ці доўгае яе жыццё, ці не,
Не ведае; вышэй за дуб жадае
Паўстаць яна, у высь нябёс імкне.
Ды холад дзьмухнуў — згасла спакваля,
Не дасягнула й росту кавыля.
Пра многае ў юнацтве сам я марыў,
Ў руцэ сініца — лепей жураўля!
Ступіўся мой булат. Твар — у маршчынах,
І хутка-хутка — забярэ зямля.

1897

* * *

Народ мой родны, ты якой
Расколаты маной?
І мой абрынуты спакой
Варожасцю скразной.

Дапамагчы другім быў рад,
Мне роўныя яны
Усе былі: і брат, і сват,
І беднасць, і чыны!

З людзьмі дзяліў я ўсё, што мог…
Дык што ж забраў у вас,
Каб гонар, што заўжды бярог,
Тапталі вы не раз?

Народу я аддаў любоў, —
У злосці і рыззі,
Вы раніце мне сэрца зноў
І топчаце ў гразі?

Ўзвялі паклёп на ўсю сям'ю…
Палёт атрутных стрэл…
Не толькі дом, — душу маю
Ўзялі вы на прыцэл.

Даволі! Не ўваб'еце клін!
Адкіньце зманны суд!
Не мерайце на свой аршын —
І так мне душна тут!

Бо ён, паклёпніцкі ваш зык,
Усіх самотней спраў.
Ды ёсць мяжа… Свой скуты ўскрык
На дне душы схаваў!

1898

* * *

О парыў душы агнявы,
Ты зіхотны, як промень адзін,
Як маланкі язык жывы,
Што прарваўся з чорных хмурын.
О радкоў маіх спеўны лад,
Зразумелы ты дурню? Наўрад!

Самых смелых памкненняў запал
Ператворыць мой верш у кап'ё,
Каб радкоў небывалы шквал
Свету нёс мастацтва маё.
Ды бяспамятна спіць народ,
Яму слова — як чэзлы лёд.

Слова розумам зразумець —
Знікне ўраз, быццам гук пусты,
Але ў жылах яму шчымець,
Як бярэш яго сэрцам ты.
Людзі вучаць, спяваюць мой верш,
Не для цёмных ён душ найперш.

1898

* * *

Ці ж не павінен я, мёртвы, глінай стаць?
Павінен вёрткі язык дзевай чыннай стаць;
Сэрца маё, дзе бой вялі страсць і гнеў,
Хутка павінна крохкай ільдзінай стаць.

Блізка мой дзень, калі мне прад спачынам стаць.
Можа марудзіць смерць, можа лавінай стаць.
Сэрца, няцяжка конскаму спрыту твайму
Паклёпаў ахвярай за сходнай часінай стаць!

Стану нямым, не прагрымлю наноў, —
Унукі асудзяць, будзь да таго гатоў.
Кроў пачарнела, у язвах сэрца маё…
Ці ж можна нас двойчы за ўчынак адзін караць?

Глыбей у душу зазірні, пабудзь сам з сабой.
Хай для цябе, як загадка, — я і шлях мой.
Слаў я, наступнік, шлях свой здавён для цябе.
Супраць няпраўды змагаўся — біўся з маной.

Свет мне прывабным быў, юнаму сілачу.
Гнеў дзе і звады — там я, бягу-лячу.
Вораг мяне прагне паклёпам даняць.
Рушыў бы ўслед, — позна! Не даімчу…

Гнёт чый трывалі вольныя думкі мае?
След мой цябе з прамой дарогі саб'е.
Ўдосталь пакутаў, удосталь палону цярпеў, —
Ці варта будзіць таго, хто ў снах снуе?

Яд ува мне і чад, хоць я не хцівец той.
Мала прайшоў я гэтай пуцінай зямной.
Усё ж балбатлівая песня — дарэмна ёй давяраў…
Лепей, відаць, змоўкнуць ёй разам са мной!

1898

* * *

Калі думка за воляй услед
Змізарнее ў сэрцы пустым,
Ты — пабачыць увесь белы свет —
Станеш быдлам бяспамятным тым.

Мой бязвольны розум, вярхі
Бачыш толькі, а не глыбіню.
І душу ўжо стамілі шляхі.
Адрахлеў, сны старэчыя сню…

Як суцішыць мне сквапную плоць? —
Шкода беднае скнары табе.
Ды не здатны плоць пабароць —
Пераможа яна ў барацьбе.

У стварэнняў душа — чарната,
І не ведаюць думак яны.
Меркне фарбаў жыцця ясната,
Калі ёй не ведаць цаны.

Чалавекам назвацца я
Не магу, бо закуты ў змрок.
Сэнс жыцця знайсці — справа мая,
Каб вярнуць чалавеку зрок.

1898

* * *

Ці забуду юнацтва, стары?
Думак лёт, спраў руплівы плён.
Хто не стрэнецца — ўсе сябры…
Бесклапоцце вясновых дзён!

Шмат — вяселле, каханне, спеў —
Кожны з нас той парою меў.
Думак лёт і святло надзей, —
Дзе шукаць іх? Час адшумеў.

Мой Алах! Дзе ж цяпер яны —
Дні любові і дні вясны?
Аддаліліся, адышлі —
Сэрцу драхламу не відны.

Клічу — толькі гудуць вятры.
Дзе ты, юны разліў зары?!
Не дагоніш, сышлі яны —
І каханая, і сябры.

Дай мне сілы — буду рыдаць,
Дай трыванне — буду чакаць.
Хай надзея лечыць мяне:
Як жадаў ты юнацтва спаткаць!

1899

* * *

На сорак абрэзкаў тугою
Пакроена ты — стынню зім…
Як сэрцу дажыць у спакоі,
Зняверанаму ва ўсім?

Хто ўзяты зямлёй, хто — бядою.
А як іх любіла ты!
Гаркоты ішлі чарадою,
І вось ты — сярод пустаты.

І старасць адна прад табою
У мораку — крочыць якраз.
Бяспечных суцешыць любое.
А дзе нам з табою адказ?

У злосці — аблічча сівое!..
Лёт мараў… Зірні на іх,
Згадаўшы памкненне былое
Жаданняў бясплодных тваіх.

1899

* * *

Чалавек — мяшок для мяса і касцей,
Смерць знаходзіць яго, як скарб — казначэй.
Як часта гучала: «Агідны, сыдзі!»
Павер жа мне: глупства — штукарствы людзей.

Учора — дзіцё ты, сягоння — стары,
Мялеюць жыцця — дзе ні глянеш — віры.
Любі чалавека, любі прыгажосць, —
Ці могуць быць лепшыя шчасця дары?

1899

* * *

Сабаку я выкарміў са шчанюка —
І зубы яго паспытаў.
Трапна страляць навучыў стралка —
Ягонай мішэнню стаў!

1899

* * *

Адзінотнае, не шукай,
Сэрца, водгуку — злосці гул!
Думка светлая, прыблукай,
Як не знойдзеш сабе прытул!

Пачуццё ў цвеце слоў — мана,
Не пачуе душа адказ.
Гоніш сэрца, як скакуна,
З поля радасці ўсякі раз.

Шчасце, дружба, любоў, спакой —
Грош цана ім, кажу, сябры, —
Імі плацяць бядзе людской
Крывадушныя гандляры.

Суд народа для іх — бязмен,
Каб узважыць хулу-хвалу, —
О, майстры крывадушных сцэн,
Колькі жыць вам, а з вамі — злу?

З кім самоту мне падзяліць,
Калі дружбы ўжо не займець?
Спачуваннямі наталіць
Ці магчыма пачуццяў смерць?

Толькі чэзласць паўсюль адна,
Пашкадуеш каго, а той
Грошы кленчыць на збан віна,
Не дасі — рушыць вораг твой.

Слову здраднаму не ўвайсці
Ў сэрца чулае без пакут.
Сцежку ў сэрца тваё знайсці
Ён не здолее, шалапут.

Ты дарэмна гарыш агнём,
Сэрца зводзячы да пары.
Бляск ад полымя меркне днём…
Дзе каханая, дзе сябры?

1900

* * *

Калі стане даўжэзным цень,
Сяйво выблісне зор
І, шлях завяршаючы, дзень
Рушыць за дальні бугор, —

Засамочуся ў цішыні,
Авалодае вечар мной,
Загарацца ў аулах агні,
Ўсё жыццё маё — за спіной.

За спіною — тая сцяга,
Што легла на гразкі дол.
Ішлі бяда ўслед і туга,
І гора ступала, як вол.

І таптаў сцягу чалавек,
І заносіў пясок не раз…
Здабываў, нажываў увесь век.
Лёс спытае — давай адказ!

Думак крыніца — пі!
Колькі іх, год маладых?
Дрэнную памяць праспі, —
Прыкрасць аброніць уздых.

Дзе спела пшаніца — палын.
Поле жыцця прайдзі.
Скажа туга: адзін!
Магілу сваю знайдзі!

1901

* * *

Спадзяваўся, што жоўтае лісце надзей.
Толькі мары нязбытна імкнулі з грудзей.
Сэрцу цяжка, трывожна, калі падалёк
Паяўляюцца твары забытых людзей.

Ты, жыццё, прамільгнула — нязбыўны мой сон.
Хай бы жыў я, не ўзяты у мараў палон.
Пазірні на сябе: ці ёсць сіла ў руках,
Ў сэрцы — жар, што калісь віраваў з юні дзён?

Як падманны міраж, гасне к людзям давер.
Мір і праўда чужымі ім сталі цяпер.
Хлусяць, крадуць; як найміты, думкі у іх.
Там, дзе сэрца, — застаўся звярыны ашчэр!

1901

* * *

Кумыс — казаха напой,
З ім госцю гонар заўжды.
Калі завітаў на той,
Дык не цурайся яды.

Бяры прахалодны кумыс
І скварыва шашлыкоў,
Калі ж маладыя мы, —
Кумыс падбадзёрыць кроў.

Пі лепей ціхі айран,
Скачы на рахманым кані.
Спакусіш зладзеяў, баран, —
Сябе аднаго віні.

З узгорка ён, твой сусед,
Цікуе ва ўсе бакі.
Калі ж разважыць як след, —
Што коні яму, што быкі.

З-за коней не варта так
Гнуць спіну — натоўп смяшыць.
Не пахваляйся, бядак,
Што варта кумыс дапіць.

Не трэба жыць з пыхай усё ж,
Мець дурня за салаўя.
Бо лепш — у кішэні грош,
Авечка адна — свая!

1901

* * *

Рагіт, маланкі анёл,
Шпурляе стрэлы на дол,
Спорны вясновы дождж
Жвава шуміць вакол.
Сіла ў маланкі — міг.
Сілу ты слоў спасціг,
З хмары маланка, — моц
Знойдзеш у словах маіх.
Пройдзе ўзбоч гэтых чар
Ёлупень і махляр.
Не прыме жабрачка-душа
Слова бясцэнны дар.
Прыме маланкі слоў
Той, хто сябе знайшоў.

Варта да рук прыбраць
Тых, хто умее лгаць.
Будзіць іх страсць адна —
З раніцы балбатаць!

1903

* * *

Домбру не кратай рукой,
Ценькай не рві струны.
Сэрца, не грукай, пастой.
Слёзы — навошта яны?

А слёзы цякуць па шчацэ —
Смутак стары жывы.
Моцы няма ў руцэ,
І не падняць галавы.

На тых, хто панік душой,
Лічыць балесна дні,
З радасцю маладой,
Каханая, пазірні!

Прашу цябе, не сыдзі,
Малю, патушы касцёр.
У свеце не заблудзі
Пад россыпам вабных зор.

Развей, прагані бяду,
Крані пяшчотнай рукой, —
І я да мэты пайду
З чыстай сваёй душой.

Стому пачула яна
Ў тлуме бязладных дзён.
Веру, што ты адна
Сэрцу падорыш плён!

* * *

Калі змоладу гонар бярог,
Калі сыпаў шчадроты рукой,
Калі ворага здужаць ты змог,
Калі верным быў дружбе сваёй,
Калі меў імя добрае ты,
Калі ўсе давяралі табе,
Калі выйшаў на шлях з нематы,
Калі сілы знайшоў у журбе,
Калі жыў, адагрэўшы чужых,
Калі зведаў любві першы боль,
Калі бедным даваў за другіх,
Калі браў — то вяртаў значна больш,
Калі думкай у высях кружыў,
Калі словам сваім даражыў,
Калі смерць не прыйсці не маліў, —
Значыць, ты чалавекам пражыў.

СЛОЎНІК

Айран — кіслае малако, прастакваша.

Аксакал — літаральна: белабароды; паважаная асоба; паважлівы зварот да старэйшага.

Бай — феадал, багацей.

Байбішэ — старэйшая жонка ў палігамнай сям'і; паважлівы зварот да пажылой жанчыны.

Батыр — волат.

Бет-ашар — літаральна: адкрыццё твару; абрадная, вясельная песня, якую спяваюць, калі здымаюць з твару нявесты покрыў, знаёмячы яе з родзічамі мужа.

Бій — правіцель і старэйшына роду, родавы суддзя.

Валасны — па-казахску балыс, кіраўнік воласці, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, куды ўваходзіла ад тысячы да дзвюх тысяч гаспадарак.

Домбра — нацыянальны двухструнны музычны інструмент.

Жар-жар — абрадная, вясельная песня-паядынак. Яе спяваюць звычайна дзве групы моладзі: мужчынская — на чале з жаніхом, жаночая — з нявестай.

Імам — мусульманскі ўладыка, які спалучае ў сваёй асобе свецкую і духоўную ўладу; духоўная асоба магаметанскай рэлігіі, праслаўленая сваімі творамі і тлумачэннямі свяшчэнных кніг.

Керэге — рашотчаты каркас юрты.

Клабучок — навочнік для лоўчай птушкі.

Кнамендзе — вясельна-абрадная песня.

Курай — сухі быльнёг з цвёрдай сцяблінай. Качэўнікі скарыстоўвалі яго ў якасці паліва.

Малахай — шырокі кафтан без пояса.

Медрэсэ — мусульманская духоўная школа.

Павятовы — кіраўнік павета (як правіла, з афіцэраў).

Саба — бурдзюк для заквашвання кумысу.

Старшына — кіраўнік аула як адміністрацыйнага падраздзялення воласці, якое складалася са 120—200 гаспадарак.

Сямей — горад Сяміпалацінск.

Той — баль, свята.

Тулпар — скакун; легендарны баявы конь.

Чапан — мужчынскае верхняе адзенне, разнавіднасць халата.

Шыльдзехана — свята, прысвечанае нараджэнню дзіцяці, радзіны.

ПЯСНЯР НАРОДНАГА ВОЛЕВЫЯЎЛЕННЯ

Памятаеце, у «Песнях жальбы» Якуба Коласа як грамадзянскі заклік і як мастацкая праграма прагучаў верш «Пясняр»?..

Кажуць людзі: «Што ты смутны?
Што спяваеш ты пра гора?
Твае песні — стогн пакутны,
Слёзы ветру на прасторы!

Ты злажы нам песню волі,
Песняй шчасця залівайся,
Ціхім спевам нівы ў полі
Ў струнах сэрца адклікайся…»

Аляксандр Пушкін у Расіі, Адам Міцкевіч у Польшчы, Махтумкулі ў Туркменістане, Тарас Шаўчэнка, Іван Франко ва Украіне, Якуб Колас, Янка Купала і Максім Багдановіч у Беларусі… Хіба не яны адкрывалі прастору для народнай ініцыятывы, для волевыяўлення мас, якія дагэтуль не заўсёды сваё роднае, нацыянальнае і сфармуляваць маглі як след?! Роўны сярод роўных, велічны ў казахскім паглядзе на свет — вялікі і неўміручы Абай. Ён не проста стаў першаадкрывальнікам новага жыцця і дарадцам казахаў, паэт здолеў разгледзець свет у самых розных праявах і якраз у той момант, калі народу патрэбна было самае яркае святло. Многія складнікі паўплывалі на тое, каб у лёсе казахаў з'явілася менавіта такая значная Асоба па здольнасці бачыць Свет і суаднесці яго ўплывы з лёсамі сваіх землякоў.

І не дзіўна, што доўжыцца чытанне Абая і ў наш час. «Творчасць Абая, яго паэзія пацвярджаюць адзін канон фі-

ласофіі, што нашы веды — гэта паверхня шара, а наша няведанне — яго аб'ём» (Бахытжан Канап'янаў). І яшчэ крыху ад Б. Канап'янава: «Чым болей мы спасцігаем, тым болей пераконваемся ў тым, што мы мала ведаем. Абай і праз сто пяцьдзясят гадоў дапамагае нам пазнаваць свет, дапамагае сувымераць нашу недасканаласць з дасканаласцю зямнога быцця». Як з гэтым не пагадзіцца?!. Тым болей, што мы разам з вамі, паважаныя чытачы, прайшлі дарогу адкрыцця неўміручай творчасці Абая ў бліскучых перакладах Міколы Мятліцкага. Пераўвасабленне вершаў казахскага акына на мову Купалы і Коласа дазваляе і нам, беларусам, выразней бачыць гістарычны шлях народа Казахстана.

О казахі мае! Мой бедны народ!
Жорсткім вусам няголеным прыкрыты рот.
Кроў — на правай шчацэ, а на левай — тлушч…
Дзе ж тут праўда? Твой розум маўчыць шмат год.

Не паганы, — чуцён славы добрай зык.
Шчыры гойнай душой, не малы на лік.
Ты не хочаш парады мае пачуць,
Рэжа ўсіх без разбору твой серп-язык.

Не ўладарыш адно над сабой самім.
Мы трывожымся днём і кашмары снім.
Ганарысты падчас, а то з крыўдай глядзіш,
Пастаянны ты ў непастаянстве адным.

Усялякі нікчэмны і хіжы зброд
Так знявечыў душу тваю, мой народ.
Дзе надзея на выпраўленне тваё,
Калі долі сваёй не каштуеш плод?

Гэтыя радкі з верша 1886 года. Абай на першыя пазіцыі ў станаўленні чалавека як асобы вылучаў гонар і годнасць. Ён быў перакананы, што яго казахскі народ мае на гэта права. І застаўся ў гэтым перакананні надзвычай актуальны.

Абай пры жыцці не ўбачыў сваёй друкаванай кнігі. І ўсё ж для ўсіх казахаў, для ўсяго Свету ён быў і ёсць Абай — сапраўд-

ны геній не толькі ў валоданні мастацкім словам, але геніяльны празорлівец, заклапочаны лёсам Казахстана і казахаў.

Казахі гавораць: «Орнында бар оналар» — «Той, хто знаходзіцца на сваім месцы, калі-небудзь заявіць аб сабе». Абай, загучаўшы па-беларуску (а першыя публікацыі Міколы Мятліцкага з'явіліся на старонках часопіса «Полымя»), ідзе і ў шырокі беларускі свет, у еўрапейскую прастору. Паэт становіцца поплеч з нашымі класікамі, творы яго пачынаюць удзельнічаць у вырашэнні адвечнай задачы мастацкага слова — яднаць здаровыя, стваральныя сілы народа, мацаваць фундамент гуманістычнага развіцця грамадства.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ,
лаўрэат прэміі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
«За духоўнае адраджэнне»

ЗМЕСТ

Мысляр, асветнік, гуманіст. *Анатоль Смірноў* 5
***О сэрца, свой жар астудзі... 7
***Вершнік з беркутам скача ў густых снягах... 10
***Быццам месяц, што выгнуты ў небе начным... 12
***Я не думаў пра веды, як быў маладзей... 14
***Вось і старасць. Скуты думкі, дрогкі сон... 15
***Адыходзіць жыццё, убывае — адно... 17
***О казахі мае! Мой бедны народ!.. 19
***Бай жыве і пільнуе статак свой... 21
***У аблуднага, вядома, не шляхі, а горкі дым... 22
***О, юнацтва пара — квет жаданы вясны!.. 23
***Да ступняў як, скажы, тваіх... 25
***Кожны за таварам едзе на базар... 26
***Пакуль не маеш, — маўчы... 27
Лета 30
***Прага ведаў збівала жыццё напавал... 32
***Верш — правадыр між слоў, іх найдарожшы ўбор... . 34
***Блізкі памірае — сэрца цісне сум... 36
Восень 38
***Зімы прадвесце — лістапад, пара ў аул, сябры!.. 39
Зіма 41
***Зыркі месяц пакінуў схоў... 42
***Ў грудзях маіх памёр давер... 43
***Вось абраны я валасным... 44
***Кіраўнік наш начальству рад... 49
***Хай будзе слова мудраца... 51
Васьмірадкоўі 53
***Калі ў душы гарыць святло... 60

***Вершаў я не пішу для пацех пустых... 62
***Востры розум чысцюткі, як пласт ледзяны... 63
***Дзве дарогі — каханне і страсць — прада мной... . . . 64
***Які ж мяне чакае лёс?.. 65
***Вітаю ўзлёт танюткіх броў... 68
***Ты змог пяшчотай адарыць... 70
***Кос чарнеча ляжыць уздоўж гнуткай спіны... 72
***Сябра стойкага між людзей... 73
***Дзе ж запал юнацкі пачуцця?.. 74
***Даўно ў душы вясновы квет панік... 75
***Тулпара не абгоніць просты конь... 76
***Не прадыхнуць... 77
***Жыццё пуцінаю вадзіла... 79
***Наталіць можна песняй душу... 81
***Аб каханні, душа, марыш зноў... 83
Вясна 84
***Было — і ў табе палымнеў агонь... 87
***Лёд і жар дакрануцца шчок... 89
***Ты — вачэй маіх зрок... 91
***Да цемрашалаў быў пагардлівым здаўна... 94
***Адкажы мне, душа, што шукаеш?.. 96
***Сэрца, не біся важка ў грудзях!.. 98
***Мне боль вучэнне нясе... 99
Аспану 101
***Малады і стары... 102
***На дабро пазабыць тут рады... 103
***Вось і восень мая надышла... 104
Мова кахання 105
***Будзь разборлівы між людзей... 106
***Я многа мудрых слоў сказаў у лёце дзён... 107
***Аб харчы смакотным век марыць галодны трыбух... 108
***Ці бачыў? — дзяцінства сышло... 110
***Калі ў ручай ступіў баран... 111
***Прах мой сатлее, ды сам я не знікну, о не... 112

Спачуванне нявестцы маёй, жонцы Абдрахмана *113*
Аплакванне Абдрахмана яго жонкай Магіш *115*
***Скаціна цешыць хціўца з году ў год... . . . . *120*
***Сярод старых я пачуваюся чужым... . . . . *121*
***Дзяўчына-красуня у хана жыла... . . . . *122*
***Напеў гэты светлы ўвесь свет абаўе... . . . . *124*
***Час пасміхнецца ці толькі міг... . . . . *126*
***Не проста гук гадзінніка — «цік-так»... . . . . *127*
***Наступнасць закрыта туманам ад нас... . . . . *128*
***Крык грубы, роў асла... . . . . *130*
***Тэрмін дзён сваіх ведаць ці ж маглі... . . . . *131*
***Чароўнай песняй пад струнны звон... . . . . *132*
***Розным людзям не вер, што высока ўзнясуць... . . . . *133*
Габідуле *134*
***Народ мой родны, ты якой... . . . . *135*
***О парыў душы агнявы... . . . . *136*
***Ці ж не павінен я, мёртвы, глінай стаць?.. . . . . *137*
***Калі думка за воляй услед... . . . . *138*
***Ці забуду юнацтва, стары?.. . . . . *139*
***На сорак абрэзкаў тугою... . . . . *140*
***Чалавек — мяшок для мяса і касцей... . . . . *141*
***Сабаку я выкарміў са шчанюка... . . . . *142*
***Адзінотнае, не шукай... . . . . *143*
***Калі стане даўжэзным цень... . . . . *145*
***Спадзяваўся, што жоўтае лісце надзей... . . . . *146*
***Кумыс — казаха напой... . . . . *147*
***Рагіт, маланкі анёл... . . . . *148*
***Домбру не кратай рукой... . . . . *149*
***Калі змоладу гонар бярог... . . . . *150*
Слоўнік *151*
Пясняр народнага волевыяўлення. *Алесь Карлюкевіч* . . 153

Абай

А13 Стэпавы прастор : выбраныя вершы / Абай ; пер. з каз. мовы М. Мятліцкага. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. — 160 с.

ISBN 978-985-6994-31-2.

Вялікі казахскі паэт Абай Кунанбаеў (1845—1904) пакінуў духоўна багатую літаратурную спадчыну, якая па праву стала трывалым падмуркам будаўніцтва суверэннага Казахстана. Паэтычная вабнасць радка, пачуццёвая пранікнёнасць, затурбаванасць гістарычным лёсам роднага народа — усё гэта надае вершам казахскага класіка чуйнае паўнагучча, робіць іх блізкімі і зразумелымі многім у свеце, у тым ліку і нам, беларусам.

«Стэпавы прастор» — першае кніжнае выданне бессмяротных вершаў Абая на беларускай мове.

Падрадковы пераклад зроблены Кайратам Бакбергенавым.

УДК 821.512.122-1
ББК 84(5Каз)-5

Літаратурна-мастацкае выданне

АБАЙ

СТЭПАВЫ ПРАСТОР

Выбраныя вершы

Рэдактар *В. Б. Спрынчан*
Мастак *А. Г. Званароў*
Камп'ютарная вёрстка *Л. В. Касцюкевіч*
Стыльрэдактар *В. А. Траццякова*

Падпісана ў друк 18.04.2011. Фармат 84×108 $^{1}/_{32}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 8,4. Ул.-выд. арк. 5,12.
Тыраж 1000 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства
«Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа».
ЛП 02330/0150496 ад 11.03.2009.
Вул. Чырвоная, 23, 220600, г. Мінск.